а

№ 4 (100) 2013


абажур

ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»
THE BELARUSIAN ASSOCIATION OF JOURNALISTS



ТРЫМАЙСЯ ПРАЎДЫ!

Алесь Бяляцкі пераабраны віцэ-прэзідэнтам FIDH



fidh
Міжнародная федэрацыя
за правы чалавека

27 траўня ў межах 38-га Кангрэса Міжнароднай федэрацыі за правы чалавека (FIDH) сябра БАЖ, беларускі праваабаронца-палітвязень Алесь Бяляцкі пераабраны на сваёй пасадзе віцэ-прэзідэнта FIDH.

У 2007 годзе ён стаў першым віцэ-прэзідэнтам FIDH з Усходняй Еўропы, у 2010 годзе быў абраны на другі тэрмін.

Сёлета за кіраўніка Праваабарончага цэнтра «Вясна», сяброўскай арганізацыі FIDH, свае галасы аддалі 76 з 90 удзельнікаў галасавання. Кандыдатуру Алеся Бяляцкага напярэдадні галасавання падтрымала прэзідэнт FIDH Сухайр Белхасен.

«Ад Арменіі да Казахстана, ад Украіны да Кыргызстана, у Грузіі і Расіі ён правёў дзясяткі даследчых місій і візітаў салідарнасці. Яго досвед быў і застаецца найважнейшым складнікам стратэгіі FIDH у рэгіёне. Са жніўня 2011 года Алесь стаў адным з вязняў, правы якіх ён заўсёды абараняў разам са сваімі калегамі…

Мы павінны паказаць рэжыму Лукашэнкі, што Алесь — па-ранейшаму адзін з нас і зусім хутка ён будзе побач з намі і працягне сваю працу віцэ-прэзідэнта Федэрацыі», — адзначыла спадарыня Белхасен у сваім выступе.

На пасадзе прэзідэнта FIDH Сухайр Белхасен (яна ўзначальвала арганізацыю шэсць гадоў) змяніў іранскі адвакат Карым Лахіджы. Спадарыня Белхасен прызначана ганаровым прэзідэнтам FIDH.

FIDH праводзіць кангрэсы кожныя тры гады, на якіх сяброўскія арганізацыі разам вызначаюць стратэгіі працы і абіраюць Міжнароднае бюро FIDH. Сёлета FIDH павялічыла свой склад са 164 да 178 арганізацый.

а
абажур
ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»
THE BELARUSIAN ASSOCIATION OF JOURNALISTS
ТРЫМАЙСЯ ПРАЎДЫ!

Выдавец: ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»
Перыядычнасць: 1 раз у 3 месяцы
Выдаецца са снежня 2000 г.
№ 4 (100) 2013 г.

Галоўны рэдактар
Уладзімір Барысавіч Дзюба

Фота на вокладках —
Паўла Курзы (1-я вокладка)
Генадзя Верацінскага (апошняя)

Выданне зарэгістравана
ў Міністэрстве інфармацыі
Рэспублікі Беларусь,
рэгістрацыйны № 833 ад 04.12.2009 г.

Падпісана да друку 04.06.2013 г.
Дата выхаду 18.06.2013 г.
Фармат 60х84 / 8.
Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк.
Наклад 600 асобнікаў.
Заказ №
Распаўсюджваецца бясплатна.

Адрас рэдакцыі:
220030, г. Мінск,
вул. Камсамольская, 7–32.
Тэл./факс: (017) 203-63-66,
(029) 126-70-98
E-mail: abajur@baj.by,
baj@baj.by
Сайт: www.baj.by

Друкарня ТАА «МЕДЫСОНТ»
ЛП № 02330/0552782 ад 01.10.2010 г.
Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Ціміразева, 9.
Тэл.: (017) 203-74-10, 203-53-41,
(029) 623-74-10
medisont@gmail.com
www.medisont.com



Так какое у нас государство?



Сергей НИКОЛЮК,
эксперт НИСЭПИ,
Республика Литва

Мы, белорусы, — мирные люди. Мирные и толерантные. Кто бы сомневался. Вот только жаль, что комбинацию двух столь замечательных качеств в одном флаконе портит статистика ООН. В 2012 г. на тысячу человек населения в Беларуси приходилось 328 заключенных. По данному показателю мы находимся в группе лидирующих стран (17-е место).

Но, несмотря на статистику, «можно с полной уверенностью сказать, что в стране обеспечен уровень общественной безопасности, достаточный для дальнейшего успешного социально-экономического развития нашего государства. И самая высокая, лично для меня, оценка, когда к нам приезжают москвичи, россияне, из Украины, особенно из западных государств и с удивлением говорят: “Как?! В этом государстве вечером еще дети на улицу выходят?”»

Таково мнение Александра Лукашенко, которым он поделился с делегатами III Всебелорусского собрания в марте 2006 г. Ничего не могу сказать о детях, но журналистам, чьи трудовые книжки не хранятся в отделах кадров государственных СМИ, выходить вечером на улицу небезопасно. Вероятность, что к ним подойдут люди в штатском и предложат пройти, существенно выше вероятности натолкнуться на подвыпившую компанию молодых людей.

Что последует далее — предсказать несложно. Алгоритм действий отечественной правоохранительной системы (люди в штатском — лишь одно из ее звеньев, защищающих наши права) отрабатывался на протяжении двух десятилетий. Но в любом случае конечную точку в подобных историях ставит суд. А как же иначе? Согласно статье 26 Конституции, «никто не может быть признан виновным в преступлении, если его вина не будет в предусмотренном законом порядке доказана и установлена вступившим в законную силу приговором суда».

Нельзя не отметить важную деталь: «Обвиняемый не обязан доказывать свою невиновность». Деталь важная, но практически бесполезная. Станете вы доказывать свою вину в неподчинении людям в штатском (нецензурной брани, отправлении естественных надобностей в общественных местах) или нет, — на результате судебного процесса это не отразится.

Если кто-то полагает, что отсутствие удостоверения журналиста независимых СМИ освобождает от гарантированных Конституцией гражданских прав и свобод, то он ошибается. Ибо сказано: «А потому не спрашивай, по ком звонит колокол: он звонит по тебе». Поэт и по совместительству проповедник Джон Донн знал, что говорил. Дело было в начале XVII в. Не зря же человечество выработало представления о вечных ценностях. И не зарекаться от тюрьмы — из их числа.

Правоту моего обобщения подтверждают опросы Независимого института социально-экономических и политических исследований (НИСЭПИ). Доля белорусов, утвердительно отвечающих на вопрос: «Обижали ли Вас за последние три года представители органов власти?» — за минувшие восемь лет ни разу не опускалась ниже 26 %. Рекорд был зафиксирован в июне 2011 г. — 34 %. Все логично: глубокий экономический кризис, как правило, начинает обрастать социальными и политическими составляющими.

«Народ не обманешь»

Рост доходов населения и постоянное педалирование «образа врага» — основные механизмы поддержания стабильности авторитарными патерналистскими государствами. К большому огорчению главы нашего государства, эффективность второго механизма в современной Беларуси невысока. И дело тут не в толерантности белорусов. Время идеологий навсегда осталось в прошлом, да и впадать в мессианство (в отличие от русских) белорусы не склонны.

Но то, что не свойственно большинству белорусов, способно формировать «картину мира» в отдельно взятых выдающихся головах. Приведу фрагмент высказывания А. Лукашенко, позаимствованный из выступления перед ветеранами Великой Отечественной войны: «Суверенная Беларусь постоянно находится под прицелом орудий необъявленной холодной войны. Кое-кто на Западе так и не смог смириться с тем, что Беларусь не стала очередной “банановой республикой”, танцующей под дудку заокеанских демократий. Нас душат санкциями, обливают грязью клеветы. Вдоль наших границ летают военные самолеты НАТО, создаются новые базы, совершаются провокации. Но никто не заставит наш народ свернуть с избранного им пути».

«Он пугает, а мне не страшно», — заметил как-то Лев Толстой по поводу творчества писателя Леонида Андреева. Это наш случай. Государственные чиновники пугают. Работа у них такая. Но пусть поднимет руку тот, кто по ночам просыпается в холодном поту после просмотра очередного сна на тему «Создание баз НАТО вдоль наших границ».

Как уверяет один весьма авторитетный культуролог, любое действие доводило бы нас до оргазма, если бы не процесс рутинизации. Обратимся к академическому словарю: «routinization — социальная ситуация, в которой регулярно повторяющееся социальное действие может осуществляться при низкой степени вовлеченности и мотивации».

Все верно. Белорусов пугают уже 19 лет. Стоит ли после этого удивляться отсутствию массового желания (мотивации) сплотиться вокруг главного борца с внутренними и внешними «врагами народа».

В июне 2011 г. шорт-лист ответственных за разразившийся кризис выглядел следующим образом (с конца): оппозиция — 2 %, Россия — 4 %, Запад — 6 %, спекулянты — 17 %, мировой кризис — 27 %, правительство — 37 %, президент — 45 %. Требуются ли тут комментарии? Полагаю, что нет.

Максимальные возможности власти по наращиванию доходов населения пришлись на временной интервал со второй половины 2003 г. (начало роста мировых цен на нефть) до 1 января 2007 г. (двукратный рост цены на российский газ). Повышение средней зарплаты до «святой» цифры в $500 в последний год третьей пятилетки едва не закончилось коллапсом «белорусской



экономической модели». Спасибо России, в очередной раз подставившей экономическое плечо компаньону по Союзному государству.

Откроем официальную биографию главного и единственного профессионального борца за народное счастье в Беларуси: «Приход к власти А. Г. Лукашенко не ожидался самонадеянной бюрократической верхушкой, установившей своеобразное “сосуществование” с прозападным националистическим крылом. Он сразу же столкнулся с глухой стеной отторжения, осложнившей государственную работу».

Но все течет, и все изменяется. От «глухой стены отторжения» образца 1994 г. не осталось и следа. Но это не означает, что специалисты по строительству стен остались без работы. На наших глазах возводится новая стена. На этот раз между главой государства и его сторонниками.

Накатывающиеся на власть экономические проблемы заставляют ее окукливаться, и народ, который согласно многочисленным заявлениям главы государства «не обманешь», прекрасно это чувствует. Соцопросы данный вывод подтверждают (табл. 1).

За шесть последних лет роль «вертикальщиков», силовиков и государственных чиновников в качестве опоры авторитаризма существенно возросла. Основные же социальные группы, обеспечившие электоральную революцию в 1994 г., свое опорное значение или сохранили (пенсионеры), или растеряли (жители села, простые люди). Тут следует подчеркнуть, что речь идет не о точке зрения экспертов, а об общественном мнении.

Таблица 1
На Ваш взгляд, на кого прежде всего опирается Лукашенко? (% от числа опрошенных)

Вариант ответа	Август 2006 г.	Июнь 2012 г.
На президентскую вертикаль	37	45
На военных, МВД, КГБ	49	57
На пенсионеров	41	40
На государственных чиновников	21	33
На простых людей	34	18
На жителей села	30	24
На директоров крупных предприятий	14	14
На специалистов	10	5
На культурную и научную элиту	8	4
На бизнесменов	5	6

Кто же замыкал, замыкает и, вне всяких сомнений, будет замыкать список групп, в поддержке которых Лукашенко нуждается в наименьшей степени? Несложно сообразить, что это группы, ответственные в современном мире за экономическую модернизацию: руководители предприятий, специалисты, культурная и научная элита, бизнесмены! Трудно подобрать лучшую иллюстрацию, способную передать специфику национальной модернизации.

Страх нарастает, доверие падает

В государстве для народа (как тут не вспомнить популярные билборды) доля граждан, полагающих, что белорусы готовы открыто выражать свои взгляды, неуклонно сокращается (табл. 2). Беларусь — классический пример современного социально ориентированного полицейского государства. И коль вклад социального фактора стабильности падает, вклад полицейского фактора вынужден возрастать.

Таблица 2
Что Вы думаете о готовности людей в Беларуси выражать свои политические взгляды? (% от числа опрошенных)

Вариант ответа	Февраль 2001 г.	Июнь 2006 г.	Октябрь 2010 г.	Июнь 2011 г.	Март 2013 г.
Никто не боится	20	19	18	11	14
Только немногие боятся	34	29	16	17	19
Сумма позитивных ответов	*54*	*48*	*34*	*28*	*33*
Многие боятся	30	40	41	46	41
Все боятся	6	8	19	22	19
Сумма негативных ответов	*36*	*48*	*60*	*68*	*60*

Таблица 3
Доверяете ли Вы следующим государственным и общественным институтам? (% от числа опрошенных)

Вариант ответа	Август 2000 г.	Апрель 2002 г.	Ноябрь 2004 г.	Июнь 2006 г.	Июнь 2008 г.	Сентябрь 2010 г.	Декабрь 2012 г.
Суды	23	29	39	45	45	49	41
КГБ	23	28	34	38	38	38	37
Милиция	18	21	34	38	40	41	37

Но рост значимости полицейского фактора не повышает рейтинги доверия его составных компонентов после 2006 г. (табл. 3). Сказывается общий кризис белорусской экономической модели. Ее патерналистский потенциал исчерпан.

И, завершая статью, попробую перейти к обобщению.

Сплоченность обществ и государств исторически определялась комбинацией трех факторов: силы, веры и закона. До появления мировых религий ведущую роль играла сила. Новая эра потому и стала новой эрой, что вере удалось потеснить силу. Окончание Средневековья в Европе и переход к Новому времени с его бурным экономическим ростом — прямой результат очередной перегруппировки внутри указанной выше «троицы», в результате чего верховенство закона стало нормой повседневной жизни европейцев.


Лукашенко, как известно, выстраивает политику «от жизни», от народной жизни, в которой закон привычно пасует перед верой, но, что еще хуже, — перед ничем не ограниченной силой государства. Сказать, что подобная политика неэффективна, значит продемонстрировать полное непонимание происходящего, так как оценивать исторический путь в категориях эффективности бессмысленно.

Фото В. Гридина



Медиаполе: оттепель «нецелесообразна»

В результате оттепели в отношениях между Беларусью и Евросоюзом в 2008–2010 годах в государственную систему вернулись подписка и распространение независимых газет «Народная воля», «Наша Ніва» и «Ганцавіцкі час». Сейчас официальный Минск снова предпринимает попытки наладить отношения с Брюсселем…



Татьяна **КОРОВЕНКОВА**

Участились встречи между дипломатами различного уровня, прошли визиты в Беларусь представителей европейских структур, белорусские власти согласились на возобновление работы шведского посольства в Минске… Пока активному возобновлению диалога препятствует принципиальный для Запада вопрос — освобождение и реабилитация белорусских политзаключенных. Раздумывая, как разрешить эту проблему, официальный Минск заодно прикидывает, что еще и за какие уступки можно продать Западу.

И белорусская медиасфера в списке «предметов» для торга занимает не последнее место.

Как своеобразный жест доброй воли можно рассматривать принятые в марте решения закрыть уголовное дело в отношении гродненского журналиста Андрея Почобута и не возбуждать дело в отношении журнала «ARCHE Пачатак». Оба этих дела вряд ли были значимы для белорусских властей, но вызывали раздражение ЕС и международных правозащитных организаций, которые при каждом удобном случае призывали белорусские власти прекратить преследование журналистов.

Увы, в белорусской журналистике столько нерешенных проблем, что любое смягчение позиции властей по отношению к прессе может преподноситься официальным Минском как большой шаг в сторону демократизации и реформ!

Но проблемы и после показательных «шагов» не исчезают.

Болезненна, например, проблема отсутствия в подписных каталогах «Союзпечати» и «Белпочты» независимых изданий. Почти неразрешимая ситуация возникла внезапно, незадолго до президентских выборов 2006 года, когда из государственной системы распространения исключили практически все независимые периодические издания общественно-политической тематики. Все попытки газет через обращения к чиновникам вернуться в каталоги и киоски натыкались на отговорку, что вопрос лежит не в политической плоскости — это, мол, взаимоотношения хозяйствующих субъектов, на этом уровне и разбирайтесь.

Основатель и главный редактор независимой региональной газеты «Вольнае Глыбокае» Владимир Скрабатун недавно предпринял попытку возобновить сотрудничество с местным отделением «Белпочты» по распространению издания и его включению в подписной каталог на второе полугодие 2013 года. Сначала редактору не отказали и даже предложили заполнить необходимые бумаги, уплатив 90 тысяч рублей и написав заявление в Витебский филиал РУП «Белпочта». Но затем пришел официальный ответ: так как обязанность по включению печатного издания в каталог не предусмотрена законодательством, то выбор этих изданий для формирования каталога и дальнейшего их распространения является

правом РУП «Белпочта». Включать в подписной каталог «Вольнае Глыбокае» посчитали «нецелесообразным».

Кроме «Вольнага Глыбокага», за бортом государственной системы распространения остаются независимые газеты «Новы час», «СНплюс. Свободные новости плюс», «Товарищ», «Борисовские новости», «Витебский курьер», «Газета Слонімская», «Intex-press» (г. Барановичи), «Нясвіжскі час», «Ляхавіцкі час», «Отдушина» (г. Слоним), «Рэгіянальная газета» (г. Молодечно). За возвращение любой из них в подписной каталог официальный Минск может ожидать от Запада неких преференций.

Отличное пространство для маневра дает белорусским властям и Закон о СМИ, ряд положений которого подвергался критике со стороны ЕС и правозащитных структур. ОО «Белорусская ассоциация журналистов» неоднократно обращалась в госорганы с конкретными предложениями по совершенствованию положений закона.

Последний ответ БАЖ получила из Палаты представителей Национального собрания Беларуси за подписью председателя постоянной комиссии по правам человека, национальным отношениям и СМИ Андрея Наумовича. По его словам, обращение БАЖ комиссия рассмотрела, «детально проработала с Министерством информации» и не видит необходимости вносить какие-либо изменения в закон ввиду «отсутствия существенных недостатков в правовом регулировании данной сферы».



Флэшмоб, организованный представителями независимых СМИ против закрытия газет «Народная воля» и «Наша Ніва», XV Международная специализированная выставка «СМИ в Беларуси», Минск, 4 мая 2011 года

«На сегодняшний день Закон Республики Беларусь “О средствах массовой информации” в целом стабильно функционирует, позволяет решить практические проблемы, возникающие в деятельности средств массовой информации, а также способствует поступательному развитию информационного пространства страны. Исходя из этого, депутаты Палаты представителей — члены комиссии считают в настоящее время нецелесообразным инициирование внесения корректировок в законодательство в области СМИ», — говорится в ответе.

Какие «стабильно функционирующие» позиции закона тревожат БАЖ? Журналистская организация не раз заостряла внимание на тех проблемных вопросах в сфере СМИ, которые необходимо решать в первую очередь. Среди них — прекращение уголовного преследования журналистов и снятие с них судимостей; введение моратория на применение уголовных статей за клевету и оскорбление президента; введение заявительного принципа аккредитации

иностранных журналистов; прекращение административных репрессий, задержаний и препятствования журналистам в их профессиональной деятельности. БАЖ предлагает ввести разрешительный принцип регистрации СМИ, обращает внимание на слишком узкую трактовку понятия «журналист» и отсутствие в законе понятия «фрилансер», а также приравнивание аккредитации к разрешению на поиск, получение и распространение информации. Кроме того, есть проблемы с правовой защитой журналистов и деятельностью интернет-медиа.

Что касается аккредитации для работы на иностранные СМИ, то это достаточно болезненный вопрос. По действующему законодательству, аккредитация необходима не только для иностранных журналистов, но и для граждан Беларуси. А поскольку получить ее не всегда возможно, как, например, в случае с сотрудниками телеканала «Белсат», то для белорусских журналистов возникла ситуация реального запрета на профессию. При этом многие работают без аккредитации, на свой страх и риск, в постоянном ожидании предупреждений от органов прокуратуры и душещипательных бесед с сотрудниками КГБ. В 2012 году было зафиксировано как минимум 13 случаев предупреждений журналистам за работу на иностранные СМИ без аккредитации. При этом возможность обжаловать отказ в аккредитации законодательно нигде не прописана.

Еще одна острая проблема — доступ журналистов к информации. Как отмечает заместитель председателя БАЖ Андрей Бастунец, принятый в 2008 году Закон о СМИ в вопросах доступа к информации «в какой-то степени сводит позиции журналиста к позиции обычных граждан, а в некоторых случаях даже ставит в еще более сложные условия».

Бастунец напоминает, что в последние годы в ряд законов были внесены изменения, согласно которым, например, информацию о деятельности госоргана могут предоставлять журналистам либо пресс-секретари ведомства, либо специально уполномоченные лица. Такие «посредники», вместо того чтобы стать источником информации для СМИ, стали еще одной преградой для журналистов.


Кроме того, новый Закон о СМИ лишил редакции особого права обращаться в государственные органы с запросами. Теперь они вынуждены обращаться с запросами на таких же условиях, как общественные организации и простые граждане, и ожидать ответа на свое обращение не раньше чем через 30 дней. Про какую оперативность в подготовке медиаматериалов здесь можно говорить? Ведь при работе с новостями такой промежуток времени просто не приемлем!

Нерешенным остается вопрос и с журналистами-фрилансерами. Реалии таковы, что сегодня в Беларуси к фрилансерам относятся не только журналисты, которые сотрудничают с традиционными СМИ, не состоя в штате редакций, но и все те, кто работает на интернет-ресурсы, не зарегистрированные в качестве средств массовой информации. У фрилансеров нет возможности получить редакционное удостоверение, что, с точки зрения белорусского законодательства, означает, что они не являются журналистами. Правовая защита «вольных» репортеров в такой ситуации остается весьма проблематичной и вызывает серьезные опасения.

Конечно, наивно полагать, что на фоне очередного потепления отношений с Западом белорусские власти решатся на кардинальные реформы в медиасфере. В период оттепели 2008–2010 годов под эгидой ОБСЕ, Министерства информации и Администрации президента в Минске были проведены два круглых стола на темы интернета и журналистской этики. Скорее всего, формат круглых столов и консультаций Минск будет использовать и теперь, если понадобится продемонстрировать какие-то позитивные шаги. В частности, власти могут опять вернуться к вопросу о регулировании сферы интернет-журналистики и принять какой-то нормативно-правовой акт. До его подписания Беларусь может провести консультации с европейскими экспертами по содержанию этого документа, учесть какие-то рекомендации, что, несомненно, получит положительную оценку Запада.

Подобные инициативы и консультации с западными экспертами вполне могут создать видимость попыток белорусских властей найти взаимопонимание и наладить диалог, но при этом реальные шаги по смягчению законодательства о СМИ и улучшению условий работы журналистов, в первую очередь негосударственных изданий, вряд ли предвидятся. Ведь прекращение разбирательства в отношении Андрея Почобута и журнала «ARCHE Пачатак» практически совпало с очередным отказом телеканалу «Белсат» в заявке на открытие корпункта в Минске и признанием «экстремистским» альбома «Пресс-фото Беларуси 2011». Увы, подходы и отношение властей к независимым СМИ и журналистам не меняются. Даже при активном диалоге с ЕС белорусские власти вряд ли пойдут на необходимые реформы в сфере СМИ — сфере, которая в Беларуси считается прежде всего идеологической.

Самарэгуляванне медыяў:



Аляксандр Класкоўскі,
mediakritika.by

У Сусветны дзень свабоды друку 3 траўня неба над Мінскам плакала, а з запрошаных прадстаўнікоў дзяржструктур ніхто на круглы стол не прыйшоў. І гэта стала сімвалічнай ілюстрацыяй да парадку дня — «Перспектывы рэфармавання медыясферы: што можа зрабіць журналісцкая супольнасць».



Дзяржаве свабода выказвання — апрыёры супроць шэрсці. І, з аднаго боку, маючы дурную сілу, а з іншага — не маючы сур'ёзнай процівагі, дзяржава тую свабоду будзе проста душыць. Ну не да канца. Каб заставалася нешта напаказ Еўропе ды дзеля мінімуму зваротнай сувязі (не ў сваіх жа «органах» вычытваць пра сапраўдныя настроі соцыуму). Сёння дастаткова трымаць на горле прэсы руку ў мяккай пальчатцы.

Гэтая дзяржава партнёрам не стане

Я не выключаю, што калі выпусцяць палітвязняў, пачнуць новыя тра-ля-ля з Еўропай, то адновяцца і нейкія супольныя пасядзелкі «чэсных» ды «нячэсных» у медыйных пытаннях. Напрыклад, пад эгідай АБСЕ, як тое было падчас адлігі 2008–2010 гадоў. Праўда, геній дзяржаўнага боку не пайшоў тады далей прапановы сінтэзаваць супольны кодэкс этыкі для дзяржаўных і недзяржаўных СМІ.

У кожным разе кан'юнктуру *«адносна вегетарыянскіх»*, паводле белсатаўца **Міхася Янчука**, палітычных перыядаў незалежная журналісцкая супольнасць мусіць выкарыстоўваць, каб адваяваць хоць квадратны міліметр свабоды. Як і ўвогуле прэсінгаваць уладу сваімі прэтэнзіямі ды прапановамі, каб чыноўнікі хоць трохі чухаліся, пра што казалі на круглым стале **Андрэй Бастунец** і **Андрэй Дынько**.

Але ілюзій быць не мусіць. Тутэйшая палітычная сістэма грунтуецца на прынцыпе «падзяляй і ўладар». Прэсу і надалей будуць разводзіць па розныя бакі барыкады, і дзяржаўныя рэдактары, якімі б добрымі хлопцамі ні выглядалі, паводле адмашкі зверху адсунуць убок усе этычныя кодэксы і паслухмяна надрукуюць любое паскудства, змяшаюць з граззю любога, на каго паказаў палец начальства.

Карацей, без змены палітычнага ладу дзяржава партнёрам незалежнай журналісцкай супольнасці не стане. І таму менавіта апошняй наканавана ўзяць на сябе ўсю няўдзячную справу распрацоўкі медыйных рэформаў на будучыню ды ўсталявання асноў самарэгулявання медыйнай сферы тут і цяпер.

Прафесійная суполка мусіць несці свой крыж

Між тым, калі на пачатку сакавіка камісія па этыцы БАЖ канстатавала парушэнні этыкі ў блогавай публікацыі **Зянона Пазняка** на сайце «Радыё Свабода», было шмат шуму. Некаторыя кпілі: «пастанова ЦК БАЖ». Убачылі ў гэтым напалеонаўскія замашкі, перавышэнне паўнамоцтваў і г. д.

Крытыкі не ўсвядомілі, што тое не было разглядам персанальнай справы Зянона Пазняка. Гэтае рашэнне камісіі БАЖ таксама не тычыцца наўпрост палітыкі ці спрэчкі пра тое, каго расстрэльвалі ў Курапатах. Такія рашэнні толькі задаюць пэўную этычную планку для прафесійных медыяў, ні болей ні меней.

У гэтым канкрэтным выпадку сутнасць рашэння ў тым, што рэдакцыі СМІ, калі там уважаюць сябе за прафесіяналаў, мусяць адказваць і за карыстальніцкі кантэнт, не дапускаць зняваг, абраз. Такі парадак і ў дэмакратычных краінах. Там адпаведнай рэгламентацыяй займаюцца нацыянальныя рады ў пытаннях СМІ.


У Беларусі фармальна існуе Грамадская каардынацыйная рада ў сферы масавай інфармацыі, але, нягледзячы на шыльду, гэтая структура — цалкам пад дзяржаўным каўпаком, яе фармуе Мінінфарм. Між тым як у дэмакратыях медыйныя рады ўтвараюцца без удзелу чыноўнікаў, на парытэтных падставах з аўтарытэтных прадстаўнікоў грамадскасці і журналісцкай супольнасці.

Цікава, што найстарэйшую на кантыненце шведскую Раду ў справах прэсы традыцыйна ўзначальвае суддзя Вярхоўнага суда. Пры гэтым варта ўсведамляць, што там суд — сапраўды незалежная галіна ўлады.

У сённяшняй Беларусі стварыць падобную паўнакроўную самакіраваную грамадскую структуру з нацыянальным статусам нерэальна. Хаця б таму, што існуе каласальны масіў дзяржаўнай прэсы, якой камандуе вертыкаль. Гэтак жа нерэальна цяпер заснаваць інстытут прэс-омбудсмена, як у той самай Швецыі ды шэрагу іншых заходніх краін.

Між тым многія пытанні ў медыйнай сферы наспелі і пераспелі. І БАЖ мусіць у пэўнай ступені выконваць

хто, калі не «ЦК БАЖ»?









місію, якую ў дэмакратычных краінах выконваюць нацыянальныя рады ў пытаннях СМІ.

У гэтым сэнсе нашаму прафесійнаму звязу наканавана «шмат на сябе браць». Задаваць журналісцкі канон, абмалёўваць этычную рамку, што мусіць быць у ідэале арыенцірам для ўсіх СМІ. Таму што болей рабіць гэта няма каму.

І не варта кідаць камяні. БАЖ, мяркую, нашмат утульней было б у амплуа гэтакага элітарнага закрытага клуба ці маленькага прафсаюзіка, які адно што выбівае даброты для сваіх чальцоў. Але БАЖ лезе на ражон. Бо хто яшчэ гэта зробіць? У палітыкаў свае гульні, шырокія масы з грамадскага жыцця выключаны.

Інтэрнэт абвастрыў этычныя праблемы

Адметна, што нашумелая публікацыя Пазняка была змешчана ў рубрыцы блогаў. Гэта лішні раз падкрэслівае: анлайнавая эпоха паставіла перад журналістыкай новыя выклікі. Грахі кшталту плагіяту, канечне, былі і раней, але інтэрнэт іх абвастрыў, а некаторыя заганы набылі характар эпідэміі.

Вось толькі некалькі балючых праблем:

• некарэктна выкарыстоўваецца чужы кантэнт (перадзіраюць без гіперспасылак ці топяць іх, выкідаюць прозвішчы аўтараў і г. д.);

• ігнаруюцца элементарныя правілы праверкі інфармацыі («вуткі» бяздумна копіпасцяцца з шалёнай хуткасцю, у канфліктах даецца слова толькі аднаму боку);

• памылкі ў анлайне выпраўляюць цішком (проста перапісваюць ці вычышчаюць непраўдзівую інфу, а трэба даваць папраўкі, каб гэта было бачна чытачу);

• у каментах квітнее хамства, пануюць абразы, вядуць рэй тролі, а мадэрацыя не працуе;

• выклікаюць пытанні паводзіны журналістаў у сацыяльных сетках (няма адпаведнай рэгламентацыі, як за мяжой).

Mediakritika.by ставіць усе названыя ды іншыя праблемы, я сам напісаў «стопіццот» артыкулаў, але гэтага мала. Мусяць быць прапісаны «дурнеўстойлівыя» правілы, якую палітыку варта весці медыям у кожным з гэтых пытанняў. І, акрамя БАЖ, гэта ніхто не зробіць.

Трактаваць канон з улікам анлайнавай эпохі

Праўда, у некаторых карыфеяў нашага цэха ёсць такі пункт погляду: не трэба вынаходзіць ровар, паколькі этычныя прынцыпы журналістыкі з часам не змяняюцца, не залежаць ад медыйнай платформы.

Так, па вялікім рахунку, тыя каноны ўніверсальныя. Як зазначае маскоўскі мэтр **Міхаіл Фядотаў**, журналісту ўвогуле дастаткова Нагорнай казані Хрыста. Але ж Хрыстос не ведаў пра гіперспасылкі. Д'ябал хаваецца ў дэталях. Чамусьці фінская Рада ў пытаннях СМІ не лянуецца даваць інструкцыі, як, напрыклад, супрацоўнікам рэдакцый працаваць з карыстальніцкім кантэнтам (блогі, форумы). Усё распісана па пунктах.

Мяркую, БАЖ не памылілася б, прысвяціўшы адно з пасяджэнняў сваёй рады менавіта пытанням самарэгулявання медыйнай сферы. На грунце дыскусіі можна было б распрацаваць адпаведны план. У прыватнасці, варта запланаваць апгрэйд Кодэкса журналісцкай этыкі БАЖ, найперш з улікам спецыфікі анлайну.

Але такія дакументы, кладучы руку на сэрца, мала хто чытае, а тым болей перачытвае. Таму камісіі па этыцы БАЖ варта было б рэгулярна разбіраць кейсы, у якіх адлюстраваны тыповыя этычныя праблемы сённяшніх СМІ. І — увага! — не толькі выносіць вердыкт (этычна ці неэтычна), але і даваць рэкамендацыі.

Тая ж пастанова пра публікацыю Пазняка была б нашмат каштоўнейшай і, магчыма, не ўспрымалася б кім-кольвек так хваравіта, калі б яе галоўным сэнсавым акцэнтам сталі парады што да працы рэдакцый з карыстальніцкім кантэнтам.

І хай бы як мага болей такога кшталту практычных рэкамендацый вісела на сайце БАЖ. Каб у канфліктных сітуацыях можна было апеляваць да нейкага канона.

Фота Б. Гарэцкага



Журналісты з залюстроўя: спроба дыстыляцыі чужых са сваіх



Таццяна Бублікава

У Мінскага мора — ад мора толькі назва. А з баклажаннай ікры нават тэарэтычна малькі не вылупяцца. Памкненне праз словы дадаць чаму-небудзь велічы нараджае блытаніну. Гэтак і ў журналістыцы — чалавек можа звацца журналістам, а насамрэч быць кімсьці іншым.

З кім і навошта ў Беларусі блытаюць журналістаў і чаму гэта некаторым не дае спакойна спаць? Разам з калегамі шукаем адказы на старонках «Абажура».

Паміж псеўдаморам, ікрой ды журналістам ёсць істотная розніца. Умоўнасць называння першых бачная няўзброеным вокам — мы ж ведаем, як выглядаюць сапраўдныя мора ды ікра. Але адрозніць сапраўднага журналіста ад аматара пісаць артыкулы — задачка не з лёгкіх, з ёй нават пракуроры не заўсёды спраўляюцца. Бо пракуроры абапіраюцца толькі на сухі голас закону. Мы ж, каб разблытаць гэты клубок, скарыстаемся супольным прафесійным досведам.

Зязюлі ў нашым лесе

На праблему памылковага наймення некаторых асоб журналістамі можна глядзець з трох бакоў: з сярэдзіны журналісцкай супольнасці, звонку як грамадства і зверху як дзяржава. Дзяржаве не хочацца, каб былі «псеўдажурналісты», бо іх дзейнасць цяжка кантраляваць. Рэдка якога прадстаўніка грамадства цікавіць, хто як там сябе называе, — ты толькі давай запатрабаваную інфармацыю і не мані. Нас, журналісцкую супольнасць, пытанне падмены паняткаў і статусаў, размывання межаў павінна непакоіць больш за ўсіх.

Мы — як птушкі, якім зязюлі падкладаюць свае яйкі: вымушаныя выпраўляць чужыя хібы і пры гэтым не забывацца на ўласныя клопаты. Рэкламшчыкі, піяршчыкі, прапагандысты, палітыкі і грамадскія дзеячы, якія імітуюць журналістыку, — вось гэтыя «зязюлі». Я наўмысна пазбягаю называць імёны, каб не даваць глебы для высвятлення стасункаў. Аднак заўважу, што часам нават аўтарытэтныя арганізацыі па нейкіх прычынах публічна прызнаюць журналісцкі статус за чалавекам, які ад журналістыкі такі ж далёкі, як марскі коцік ад свайго сабрата па найменні.

Не так істотна, ці самі яны называюць сябе журналістамі, ці проста не выпраўляюць некарэктнае меркаванне пра сябе іншых. У корані праблемы ляжыць менавіта памылковае прылічэнне іх дзейнасці да журналістыкі.

У які момант становяцца журналістам?

Механізм узнікнення блытаніны і падмены паняткаў у нашай сітуацыі вельмі просты, і палягае ён, як падаецца, у этымалагічных нетрах. Глядзіце, хлебапёк — гэта той, хто пячэ хлеб, ткач — той, хто тчэ. Адпаведна гэтай логіцы, журналіст — той, хто займаецца журналістыкай. А прадмет працы журналіста ў першапачатковым сэнсе — напісанне артыкулаў. Напісанне артыкулаў і публікацыя іх у масмедыя становяцца прыкметай прафесіі журналіста. Вось гэта і ёсць глеба, на якой нараджаюцца памылковыя меркаванні пра тых або іншых асоб.

Цікава заўважыць, што чым складаней інструмент працы журналіста, тым меней у яго псеўдакалег. У сферы тэлебачання і радыё, бадай, «памылковых» журналістаў менш за ўсё. Бо для імітацыі журналістыкі ў гэтай сферы трэба авалодаць спецыяльнымі прафесійнымі ведамі. А фоткаць і пісаць артыкулы кожны, як у народзе кажуць, лайдак зможа.

Але ці дастаткова рабіць штосьці, як журналіст, каб ім стаць? Мае калегі прызнаюцца, што журналіст — гэта ўнутранае адчуванне. І нават пасведчанне супрацоўніка СМІ не заўсёды дае такое адчуванне.




Яніна Мельнікава, рэдактарка «Mediakritika.by», лічыць, што чалавек не становіцца журналістам, як толькі апублікуе артыкул.
«Справа не ў артыкуле як такім, бо ўсе мы хоць бы ў школе нешта пісалі, а, хутчэй, у рэакцыі на яго. Вось тэлефануе чалавек у рэдакцыю, кажа *"чытаў, асуджаю"* ці, наадварот, *"чытаў, дзякуй"*. І ты адразу разумееш, што не ў стол пісаў, што была патрэба, што кагосьці зачапіла. І з'яўляецца (прынамсі я ўпэўненая, што павінна з'яўляцца) пачуццё адказнасці за слова. Менавіта гэтаму пачуццю не навучаць на журфаку, напрыклад. Таму і кажуць калегі-прафесіяналы: журналістыцы трэба вучыцца "ля станка", тут адной тэорыяй не абыдзешся. Яшчэ адчуванне прыналежнасці нараджаецца ў момант, калі сустракаешся з праблемамі, калі табе ці іншым патрэбная дапамога, журналісцкая салідарнасць. Менавіта тады, мо яшчэ сам сябе не ідэнтыфікуючы з гэтым журналісцкім цэхам, ужо пачынаеш імкнуцца стаць яго часткаю. Памятаю, я сама, ужо працуючы ў "Газеце Слонімскай", трапіла на фэст зачыненых газет, які ладзіла БАЖ. І там сутыкнулася ўпершыню з гісторыямі Мажэйкі, Маркевіча, Завадскага. І, бадай што, упершыню адчула гэтае жаданне быць часткаю такой мужнай і такой адданай сваім ідэалам суполкі. Хоць да таго моманту ўжо ўніверсітэт амаль скончыла».

Журналіст і яго пасведчанне

У Беларусі журналісцкае пасведчанне ўяўляе сабой дакумент перабольшанай каштоўнасці. Дзяржава бізуном прывучыла нас думаць, што сапраўдныя журналісты павінны мець журналісцкае пасведчанне дзяржаўнага ўзору. І ў ідэале гэткія ўмовы гульні маглі б вызваліць нас ад неабходнасці вышукваць у нашых шыхтах імітатараў. Замест таго беларуская рэчаіснасць пазбавіла прафесійных правоў вялікую частку сапраўдных журналістаў.

Медыяэксперт Паўлюк Быкоўскі мяркуе:
«У Беларусі пытанне загнанае ў такую бюракратычную працэдуру, што значная частка журналісцкага цэха не мае фармальных падстаў лічыцца журналістамі так, як гэта разумее Міністэрства інфармацыі».



Паводле Закона аб СМІ, фармальных падстаў лічыцца журналістамі не маюць супрацоўнікі незарэгістраваных медыяў. Гэта як донарскія, так і камерцыйныя медыі. Адным з такіх інфармацыйных рэсурсаў з'яўляецца магутны TUT.BY.

Журналіста стварае аўдыторыя — прыклад TUT.BY

Супрацоўнікі прэсавай часткі TUT.BY, як ні дзіўна, фармальна не маюць статусу журналіста СМІ. Аднак штодзённа выконваюць якасную журналісцкую працу, маюць поспех і попыт у аўдыторыі. Што дазваляе «тутбайцам» адчуваць сябе журналістамі і адкуль бярэцца гэтая ўпэўненасць?



Пра гэта расказала **рэдактарка, журналістка рэсурсу TUT.BY Алёна Андрэева:**
«Мы не зарэгістраваныя як СМІ толькі праз тое, што Саўмін так і не распрацаваў працэдуру рэгістрацыі сеціўных СМІ. Нас часта штурхаюць дзяржорганы за тое, што мы не СМІ, калі ім гэта зручна, а калі мы ім патрэбныя, нам прызнаюцца ў любові і просяць дапамогі. Бо такога ахопу аўдыторыі няма ні ў кога. Мы займаемся дзейнасцю, якая адпавядае вызначэнню журналістыкі, хаця, канешне, корачак у нас няма. Пры гэтым у працоўных кніжках, напрыклад, маем запісы *журналіст* ці *рэдактар*.
Сябе журналісткай я адчула тады, калі праз пэўны час пасля напісання матэрыялаў для розных СМІ да мяне пачалі звяртацца людзі, якія лічылі, што толькі я сваёй працай магу ім дапамагчы. То бок я магу напісаць пра іх бяду ці радасць так, што гэта будзе цікава многім (чытачам, слухачам), што ў іх з'явіцца магчымасць праз публікацыю вырашыць пэўнае пытанне, або паўплываць на ход нейкага працэсу, або агучыць грамадска значную праблему».

Такі самы, але з перламутравымі гузікамі

Злавіць за хвост адрозненне журналістыкі ад падобнай да яе дзейнасці можна на прыкладзе сайта палітычнай партыі АГП — www.ucpb.org. Трэба адразу адзначыць, што супрацоўнікі сайта публічна не прэтэндуюць на званне «журналіст».

Чытач можа знайсці на старонцы партыі тыя ж жанравыя складнікі, што і на рэсурсе TUT.BY: гэта і навіны, і артыкулы, і нават ёсць сваё «АГП-ТВ». Яно ўяўляе сабой нізку відэастужак, дзе ёсць вядоўца і суразмоўца. Па фармаце відэа сайта нагадвае перадачы з традыцыйнага тэлебачання. Нават вядоўца — намеснік старшыні партыі Леў Марголін — паводзіць сябе, як журналіст: знаёміць з госцем, задае пытанні, падводзіць вынікі, звяртаецца да гледачоў.

Калі звяртаць увагу толькі на форму, то працу сайта АГП можна было б назваць журналісцкай дзейнасцю. Аднак калі глядзець на змест, то толькі лянотны не заўважыць наўпростага, не прыхаванага акцэнту на тое, што перад намі палітычны праект. На рэсурсе чырвоным па белым напісана, што гэта сайт партыі, што навіны — партыйныя і тэлебачанне таксама тут — спосаб прасоўвання партыйных ідэй.

Трэба сказаць, што сайт партыі АГП трэба прыводзіць у якасці пазітыўнага прыкладу, як палітыкі могуць сумленна

і карэктна выкарыстоўваць журналісцкія інструменты дзеля сваіх мэтаў, пры гэтым не парушаючы межаў сваёй кампетэнцыі.

На жаль, у Беларусі існуюць палітычныя рэсурсы, якія ў нашай сітуацыі можна прыводзіць як негатыўныя прыклады. І мы з вамі ведаем адрасы іх старонак.

Каго і чаму прымаюць за журналістаў?

Зрэшты, разабраўшыся, хто такі сапраўдны журналіст, можна з лёгкім сэрцам прымацца за будаванне межаў. У спробе дыстыляцыі чужых са сваіх апелюем да меркавання калег.

Алёна Андрэева: «Па-першае, з журналістамі блытаюць грамадскіх актывістаў. У свой час многія з іх атрымалі пасведчанні БАЖ, якія з нядаўняга часу не з'яўляюцца пацверджаннем журналісцкага статусу. Людзі прыкрываліся імі на акцыях пры затрыманні. Пры гэтым псуючы нашую рэпутацыю: тут лозунгі крычаць, а тут журналісты яны. Па-другое, з журналістамі блытаюць піяршчыкаў з грамадскіх і камерцыйных структураў. Яны ж са СМІ камунікуюць, але сваімі паведамленнямі клапоцяцца пра інтарэсы структуры, якая банальна плаціць ім грошы».

Яніна Мельнікава: «Тут ёсць два прынцыпова розныя моманты. Першы: сапраўды журналістамі могуць называць публіцыстаў, пісьменнікаў, якія проста час ад часу выказваюць свае меркаванні на старонках выданняў. І, канешне, мы разумеем, што гэтая іхная часовая супраца са СМІ дае ім такое права, хоць і вельмі ўмоўнае. З іншага боку, у нас журналістамі называюць і тых, хто займаецца піярам, хто працуе на розных палітычных сайтах.
Чаму так адбываецца? Таму што нашае «гета» такое маленькае, таму што шмат гадоў мы, журналісты, дазвалялі лічыць іншым, што гатовыя плыць з імі ў адной лодцы. І такім чынам былі размытыя нашыя прафесійныя межы, сталіся не надта істотнымі нашыя прафесійныя стандарты, мы самі пагадзіліся на тое, каб ва ўмовах "вайны" заняць пэўны бок барыкадаў. І, у рэшце рэшт, атрымалася так, што ў нашай прафесійнай лодцы з'явіліся людзі, якія займаюцца іншай справай, але якіх нашая "прафесійная салідарнасць" ужо не дазваляе кінуць за борт. Таму працягваем руку, дапамагаем, калі ёсць патрэба, бо ўжо прынялі іх у сваю суполку».

Дэвальвацыя даверу да прафесіі

Калі ў пэўную галіну трапляюць непрафесіяналы, якія не ўмеюць або не хочуць трымацца стандартаў, то агульная прафесійнасць галіны зніжаецца. Гэта адбіваецца на аўдыторыі, якая пачынае меркаваць, што *журналісты прадажныя, журналісты брэшуць, ад іх дапамогі не дачакаешся* і г. д. А гэта ўжо становіцца нашай з вамі праблемай.

Яніна Мельнікава: «Між тым нельга казаць, што ўсе людзі, якія, напрыклад, працуюць на палітычных сайтах, не маюць права называцца журналістамі. Бо існуе і цалкам можа працягваць існаваць партыйная прэса, якая займае пэўныя пазіцыі, асвятляе падзеі пад пэўным ракурсам. Тут галоўнае, каб чалавек прымаў асноўныя прафесійныя стандарты журналістыкі, памятаў пра этыку, не забываўся на тое, што ягоная задача — гэта асвятленне падзеяў, а не "прыдумлянне" рэчаіснасці».

Сённяшняе становішча медыяэксперт **Паўлюк Быкоўскі** ацаніў як «дэвальвацыю даверу»:
«Людзі, якія займаюцца палітычнай дзейнасцю і прапагандай, вельмі часта выходзяць за межы прафесіі і займаюцца журналістыкай. І вось тут вельмі цяжка правесці мяжу і вызначыць, у які момант чалавек служыць грамадству ў якасці журналіста, а ў якім выпадку спрабуе маніпуляваць соцыумам, выступаючы ў якасці прапагандыста, рэкламшчыка, піяршчыка і г. д. Гэта вельмі складана рабіць, калі людзі спалучаюць гэтыя заняткі разам. Такое спалучэнне або памылковае прылічэнне тых або іншых асобаў да прафесіі журналіста прыводзіць сапраўды да дэвальвацыі даверу да журналісцкага цэха ўвогуле, што ў Беларусі зараз рэальна прысутнічае. У краіне цяпер губляюць давер шмат якія грамадскія інстытуцыі, акрамя, здаецца, царквы і пажарных. Пры гэтым трэба неяк жыць і спрабаваць памяняць тэндэнцыю».

Ліцэнзія на журналісцкую зброю

Незалежная прэса на ўласнай скуры адчула, наколькі актыўна дзяржава клапоціцца, каб у прафесію не траплялі лішнія, па меркаванні ўлады, людзі. Дзяржава рэгулюе гэтае пытанне і праводзіць, хаця і спрэчныя, але дакладныя і зразумелыя межы.

Чаму мы не робім тое ж самае? Калі мы бачым, што высілкі ўлады не эфектыўныя, што межы ўсё адно размываюцца, што губляецца прафесійнасць і дэвальвацыя сапраўды адбываецца, то чаму б нам самім не заняцца самарэгуляваннем у сваёй журналісцкай супольнасці?

Зрэшты, журналістыка — гэта зброя, на валоданне якой трэба мець у пэўным сэнсе дазвол. Прэтэндэнт мусіць даказаць, што яго псіхічны, фізічны стан, узровень прафесійнай падрыхтоўкі адпавядаюць адказнасці, якую ён на сябе бярэ. І няўжо не варта сачыць, каб нашая зброя трапляла ў надзейныя рукі і выкарыстоўвалася па прызначэнні?

Фота аўтара

Веревка для законодателей



Эдуард МЕЛЬНИКОВ, mediakritika.by

Интересная новость из Москвы: правительство России внесло в Госдуму поправки в Трудовой кодекс. Если они будут приняты, то журналистов и актеров обяжут каждые пять лет подтверждать свою профессиональную пригодность.



Photo.bymedia.net

Для этого вводятся конкурсы на замещение должности творческого работника. Если кто-то переаттестацию не прошел, то будет уволен в соответствии с новой статьей Трудового кодекса, которую и собираются вводить. Самое печальное, что нигде не указаны критерии оценки творческого потенциала и, соответственно, профессиональной пригодности журналиста или актера. При этом руководители СМИ от участия в конкурсе освобождаются.

Большой простор для предположений.

Скорее всего, под профпригодностью авторы этих поправок понимают необходимый уровень лояльности к властям. В сегодняшней России этому удивляться не приходится. С журналистами все понятно: многие из них, «независимые», портят кровь чиновникам. Но актеры-то, актеры в чем провинились? Неужели колоннами выходили на Болотную площадь? Или несли с телеэкранов не то, что прописано в сценариях, а в театрах слишком вольно трактовали классику? Впрочем, многие цитаты из Островского, Горького или Чехова сейчас прозвучали бы весьма современно. А уж из Салтыкова-Щедрина... В общем, достойно пера фельетониста.

Но ситуация складывается, скорее, тревожная, чем комичная. В подобного рода действиях прослеживается своя логика и последовательность. Можно вспомнить, что в ноябре 2010 года в отраслевом комитете Госдумы обсуждался вопрос о введении лицензий для осуществления журналистской деятельности. Не прошло, однако. Сейчас решили вернуться к этому вопросу «в пакете» с актерами.

Поправки в Трудовой кодекс могут сыграть роль того же лицензирования, но без нежелательных политических последствий, например, параллелей с фашистской Италией, где такое лицензирование существовало.

Сутью же остается все то же: сделать журналистов управляемыми. Иными словами, создается такой механизм самоцензуры, который работает надежнее, чем цензура внешняя, да к тому же и обходится гораздо дешевле.

Если это станет реальностью в России, то такую юридическую новацию с энтузиазмом примут и в Беларуси — партнере по «союзному государству». Во всяком случае, все предпосылки для этого имеются. Наши чиновники от информации уже заявляли о целесообразности лицензирования журналистской деятельности. Сейчас российские коллеги подают им привлекательный пример «цивилизованного» решения проблем взаимоотношений с независимой прессой.

Не нужно большого воображения, чтобы представить себе такую ситуацию. Любое СМИ как юридическое лицо обяжут регулярно проводить аттестации сотрудников на «профпригодность». Отказ руководителя СМИ, каким бы он ни был «независимым», означает невыполнение Трудового кодекса со всеми «вытекающими». И это еще одна дубинка против негосударственной прессы. При этом ставится задача избавиться от именно тех сотрудников, которые докучают властям. Невыполнение такого государственного «заказа» может породить новые репрессии на совершенно «законных» основаниях. Не нужно забывать, что у нас любые законы обрастают кучей подзаконных актов, позволяющих вертеть любую ситуацию в любую сторону. Например, возникает инструкция, предусматривающая обязательное участие в комиссии по аттестации представителя Министерства информации. Т. е. под нарушение Трудового кодекса можно подвести любого руководителя СМИ, даже если он защищает своих сотрудников. А это значит, что «подвешивают» и его, руководителя.

Таким образом, управляемость прессы достигается без громких, на всю Европу, скандалов, утомительных «замачиваний» отдельных изданий, посадок и прочих неприятностей.

Кажущаяся бесконтрольность интернет-СМИ тоже может оказаться недолгой.

В этих условиях обостряется проблема, связанная с выяснением «профпригодности» журналиста. А именно его соответствия стандартам специальности, которые сложились в течение более чем четырехсот лет существования профессиональных СМИ.

Особый статус журналистской деятельности закреплен в сотнях международных и национальных документов, важнейшими из которых для нас, очевидно, будут Международный пакт о гражданских и политических правах (ст. 19), ратифицированный Республикой Беларусь в 1993 году, а также Конституция Беларуси (ст. 33 и 34). Именно эти документы являются правовым фундаментом практической реализации свободы слова (включая и социальную ответственность журналиста), которая и является основной функцией СМИ. Да, это повсеместно нарушается у нас, но ориентир существует. Но сейчас под этот фундамент подводят мину, стремясь подменить объективные критерии сиюминутными интересами власти.

Каждый, кто работает в журналистике не один год, наверное, согласится с тем, что здесь необходимы такие навыки и моральные обязательства, без которых нельзя называть себя сотрудником СМИ. Ни журналистские корпорации (профессиональные союзы, крупные редакции и пр.), ни тем более общество и государство не отрицают необходимость наличия некоего пропуска в профессию, в которой ошибки обходятся весьма дорого. В этой связи часто вспоминают врачей и юристов, работающих по лицензиям.

В нашей профессии также проходит непрерывная аттестация на приверженность принципам и этическим нормам журналистики. Однако журналистское сообщество и государственные органы смотрят на эту проблему с разных сторон. Первые — с точки зрения сохранения фундаментальных свобод прессы, другие — с позиции урезания этих свобод, сведения журналистской деятельности к определенного рода службе.

Поэтому дискуссия о статусе современного журналиста в контексте изменений, вносимых новейшими информационными технологиями, приобретает особое значение. Можно сказать, что это еще один аспект развернувшейся в последние месяцы на mediakritika.by полемики, который до сих пор не прозвучал.

— Новенький? Тогда запомни для начала два главных правила. Первое: вот у входа ведро для малой нужды. По-большому здесь выводят в туалет два раза в сутки. Так вот, если захочешь справить малую нужду, смотри, чтобы в этот момент никто в камере не ел. И наоборот: прежде чем есть, посмотри, чтобы никто не справлял нужду. Правило второе: ни слова о сексе, ни слова, это — категорически!

Надо сказать, по первому правилу у меня вопросов никаких не было. По опыту трехсуточной отсидки в мае 2010 года в СИЗО ГУВД на Окрестина я уже знал, как тщательно зэки следят за своим здоровьем вообще и гигиеной в частности. А вот второе правило вызвало недоумение:

— Что, даже анекдот о сексе рассказать нельзя?

И подполковник Василий, которому на тот момент было 36 лет и который в камере по возрасту до меня был самым старшим, спокойно так ответил:

— Я в этой клетке 10 месяцев под следствием сижу. А вот он, — жестом руки показал на лежавшего на нижних нарах Романа, 30-летнего предпринимателя, — уже полтора года...

Едва разобравшись с дефицитом секса, пришлось столкнуться с дефицитом информации.

Вообще-то, по внутренним правилам СИЗО КГБ, в камерах разрешается иметь телевизор, а каждый подследственный имеет право выписывать газеты и журналы. Причем, насколько я понял, безо всяких ограничений: и «государственные», и «негосударственные». Во всяком случае, мой сокамерник Юрий (в «мирской» жизни — заместитель начальника следственного отдела областной прокуратуры, арестован и затем осужден к пяти с половиной годам за взятку) выписывал и получал прямо в камеру «БелГазету».

Но так было до той поры, пока в «американку» не попали мы, политические. Появление фигурантов Площади администрация СИЗО сопроводила жесткой информационной блокадой всех следственно-арестованных. В этот же день, 20 декабря, в камере отсоединили антенну телевизора. Газеты и журналы перестали приходить, а на все жалобы выписывавших прессу арестантов начальник СИЗО отвечал отговоркой, ссылаясь на какие-то временные технические проблемы.

Газеты изымались даже из передач от родственников, где они использовались в качестве оберточной бумаги под колбасу и сало. Из-за нас, политических, от информации таким образом были отрезаны все обитатели «американки».

Видимо, администрация СИЗО таким образом пыталась решить сразу две задачи: отрезать фигурантов Площади от любых новостей с воли, чтобы было легче сломать психику, и настроить против нас остальных арестованных.

Первое у администрации получилось. Второе, должен отдать должное всем своим сокамерникам, — нет.

Поначалу мы обходились старым запасом газет, скопившихся в основном после прежних передач от родственников. Арестованные подстилали их на металлическую решетку нар под тонюсенькие тюремные матрасы — так было мягче спать. Информационный голод вынуждал нас периодически извлекать эти запасы и использовать старые газеты по прямому назначению — не в качестве подстилки, а для чтения.

Невероятной ценностью были газетные кроссворды! Это настоящее спасение для камерного времяпрепровождения перед отбоем — когда выключается основной свет и загорается тусклая лампочка дежурного освещения. Я до сих пор сражен коллективным интеллектом камеры № 13: не было ни одного кроссворда, который мы бы не разгадали. И это при отсутствии интернета и словарей, все по памяти. Люди-то в «американке» сидят не простые. В основном за экономические преступления и злоупотребления. Сплошь начальники. У каждого почти по два-три высших образования. Кто-то специалист в технике, кто-то сильный гуманитарий. Короче, щелкали мы эти кроссворды, как орешки.

За все время отсидки (а под подписку о невыезде я вышел только 29 января) газет в камере так и не появилось. В самом конце моего «американского» срока пообещали включить телевизор. И включили-таки. Но трансляции обычных телеканалов при мне не было. Крутили квазиисторический и псевдодокументальный, на мой взгляд, фильм Юрия Козиятко «Новейшая история». Все серии подряд, несколько дней с повторами. До тошноты. Видимо, чтобы мы прониклись чем-то кому-то нужным и стали на путь исправления.

Но это уже не имело никакого отношения не только к сексу, но и к информации...

Аляксандр Бахановіч: дырэкторыя па-беларуску



Андрэй ЧАРНЯКЕВІЧ,
кандыдат
гістарычных навук,
Гродна

*«Вельмі верагодна, што Вам… прыходзілася ня раз чуць маё імя. Калі не, дык Вам не саставіць вялікай цяжкасці асведаміцца ў Краі а маёй асобе і дзейнасці. Я той амаль адзіны беларус, селянін па паходжанню, каранны жыхар і ўраджэнец Гродзенскага ўезду, які з першых дзён існавання "беларускага пытання" стаяў і працягвае стаяць на пазіцыі поўнага едзінення Края са ўсёй астатняю Расіяй. З гэтай прычыны мне прыходзіцца вясці барацьбу з пропаведзью ўсіх іншых ідэй, безумоўна, не маючых нічога агульнага з сапраўднымі жаданнямі беларускага народу…»**
Так ахарактарызаваў сам сябе Аляксандр Бахановіч у лісце да вядомага расійскага тэрарыста Барыса Савінкава восенню 1920 года.

Ад рэдакцыі. У гістарыяграфіі прозвішча А. Бахановіча сустракаецца не вельмі часта, у адрозненне ад іншых змагароў за «беларускае шчасце». З сівой мінуўшчыны, з часоў Сярэднявечча, у сярэдзіне XIX і напачатку XX стагоддзя, калі прыйшлі Саветы, марылі беларусы пра волю і самастойнасць. Толькі прадавалі іх мару, бессаромна ашуквалі, як дзяцей, і гвалтам насаджалі чужую палітыку, непрымальны лад жыцця. Гэтым займаліся як апантаныя камуністычнай ідэяй бальшавіцкія правадыры, гэтак і рознага колеру эмісары з больш далёкага замежжа.
Дагэтуль на вуліцах і плошчах беларускіх гарадоў стаяць помнікі-ідалы тым, хто нават і дачынення не меў да нашай Бацькаўшчыны, а калі і меў, то вельмі апасродкаванае ці якое прынесла новыя выпрабаванні беларусам. Было ў нашай гісторыі дастаткова людзей, якія ахвяравалі сабой, якія мелі гонар і годнасць, мужнасць і смеласць у адстойванні сапраўды нацыянальных інтарэсаў. Аднак у гістарычных падручніках і даведніках, напісаных палітычна заангажаванымі «спецыялістамі», іх імёны амаль не згадваюцца, а калі і згадваюцца, то надта павярхоўна. Таму мусім прапанаваць на старонках «А» новую рубрыку «Героі і псеўдагероі Беларусі». Ніякай ідэалогіі, ніякіх эмоцый. Толькі факты, толькі архіўныя дакументы ды ўспаміны сведкаў тых ці іншых падзей.

* Тут і далей у цытатах захоўваецца правапіс арыгінала.

Каб даведацца больш пра асобу А. Бахановіча, «запытаемся» ў ягоных сучаснікаў, кім жа насамрэч з'яўляўся чалавек, які называў сябе «адзіным сярод выплыўшых зараз на паверхню беларускіх палітычных дзеячаў, які добра ведае аб усіх патрэбнасцях і жаданнях Краю…».

Антон Луцкевіч, на той момант старшыня Рады міністраў БНР, неяк пачуўшы пра Бахановіча, тут жа адрэагаваў: «…Пахне звычайнай палітычнай авантурай…» [6] Прадстаўнік генерала Урангеля ў Варшаве быў больш стрыманы і ліст А. Бахановіча пракаментаваў наступным чынам: «Мною атрыманы наблагапрыятныя водгукі адносна папярэднай дзейнасці Бахановіча як у якасці беларускага дзеяча, гэтак і ў якасці старшыні рускага камітэта». Аднак больш поўную характарыстыку даў яму намеснік польскага генеральнага камісара ўсходніх зямель (Грамадзянскае ўпраўленне Усходніх зямель — орган на акупаваных тэрыторыях былога ВКЛ. — *Рэд.*) Е. Івашкевіч: «Бахановіч з'яўляецца вельмі зручным аферыстам і палітычным шарлатанам, нацягіваючым альбо беларускую, альбо расейскую маскі. Ходзіць яму толькі аб матэрыяльных карысцях, дзеля якіх ён з лёгхасцью адмаўляецца ад галоўных прынцыпаў…» [1, s. 59]

Аляксандр Бахановіч, хутчэй за ўсё, паходзіў з мястэчка Азёры, што каля Гродна. Пасля заканчэння Віленскага пяхотнага вучылішча даслужыўся да паручніка інжынерных войскаў у складзе 1-га

Сібірскага палка. Ягоная палітычная кар'ера пачалася ў 1917 годзе, калі пры падтрымцы А. Керанскага ён стварыў Гродзенскі вайсковы саюз. Пасля бальшавіцкага перавароту ў 1917 годзе А. Бахановіч узначаліў Цэнтральны камітэт аб'яднаных грамадскіх арганізацый Гродзенскай губерні ў Петраградзе. А 22 чэрвеня 1918 года ён нават атрымаў паўнамоцтвы ад віленскага Беларускага народнага камітэта (БНК) на тое, каб весці перамовы з савецкімі і нямецкімі ўладамі пра вяртанне бежанцаў і іх маёмасці з Расіі ў заходнія беларускія губерні.

Паводле А. Сідарэвіча, першы раз А. Луцкевіч сустрэўся з А. Бахановічам улетку 1918 года. Захаваўся чарнавік ліста А. Луцкевіча да начальніка адміністрацыі акупаваных тэрыторый фон Фалькенгаўзена з просьбаю прыняць дэлегацыі Віленскай беларускай рады (братоў Луцкевічаў і Дамініка Сямашку) і Цэнтральнага камітэта аб'яднаных грамадскіх арганізацый Гродзенскай губерні (А. Бахановіча ды П. Мінька), каб абмеркаваць умовы і магчымасці вяртання ўцекачоў і выгнанцаў з Гродзеншчыны да сваіх гаспадарак [13].



У ліпені 1918 года, калі Цэнтральны камітэт аб'яднаных грамадскіх арганізацый Гродзенскай губерні разагналі бальшавікі, ягоны старшыня пераехаў у Кіеў, дзе далучыўся да Кіеўскай Нарады беларускіх палітычных дзеячаў — арганізацыі расійскіх афіцэраў шавіністычна-манархічнага кірунку [3, с. 554].

Вось што піша пра тыя часы сам А. Бахановіч: «...На ўсялякі выпадак хачу Вас асведаміць, што прыналежу да партыі народных сацыялістаў, а з боку "беларускіх дзеячаў" вялікай сімпатыяй не карыстаюся, часцей ад іх падвяргаюся ўсялякай травлі, так як не спачуваю ня іх сепаратыстычным імкненням, ня іх мелкім, адзін супраць другога, інтрыгам...»

Уласна кажучы, гэта А. Бахановіч быў спецыялістам па ўсялякіх інтрыгах. Яшчэ ў Кіеве ён паспрабаваў арганізаваць кампанію супраць прадстаўнікоў урада БНР А. Цвікевіча ды М. Доўнар-Запольскага. Справа ў тым, што А. Цвікевіч па прыездзе з Мінска ў Кіеў увосень 1918 года заняў пасаду генеральнага консула БНР ва Украіне. Тут якраз выявіліся вялікія злоўжыванні беларускай Гандлёвай палаты, дзейнасць якой нават расследавала рэвізійная камісія Украінскага ўрада. Замест палаты А. Цвікевіч арганізаваў Беларускае гандлёва-эканамічнае бюро. «Нічога добрага са ўсёй гэтай дзейнасці не выйдзе, — пісаў А. Бахановіч да А. Луцкевіча, — а скандал і сорам дзеля беларускай справы наспявае вялікі... Яшчэ раз настойліва прашу із'яць з "высокіх сфераў" А. Цвікевіча, інакш будзе беда і сорам...» [6]

У пачатку 1919 года А. Бахановіч быў ужо ў Адэсе. Пазней, у 1921 годзе, Антон Луцкевіч апісаў яго і ягоныя дзеянні ў артыкуле з красамоўнай назвай «Самазванцы»: «...Пад націскам бальшавікоў на Кіеў, дзе пры Скарападзкім была сабралася ўся расейская рэакцыя, гэныя чорныя крукі пачалі ўцякаць у Адэсу. І тут на рубяжы 1918–1919 гадоў мы бачым новую спробу спэкуляцыі на беларусах. Гэтым разам папрабаваў шчасьця нейкі авантурнік Бахановіч (з Горадзеншчыны), быўшы некалі афіцэрам у расейскай арміі. Бахановіч гадоў дваццаць бадзяўся па Расеі, калі ж узьнялася бальшавіцкая рэвалюцыя, ён завёў нейкія падазрыцельныя адносіны зь немцамі і пры іх помачы прыяжджаў зь Пецярбургу на Беларусь. Не знайшоўшы тут грунту для сваёй спэкуляцыі, ён перакінуўся ў Кіеў і з усёй маскоўскай чорнай сотняй перасяліўся адтуль у Адэсу. Карыстаючыся з таго, што з Бацькаўшчынай не было ніякае сувязі, Бахановіч заявіў тамтэйшым беларускім арганізацыям, быццам у Менску Рада Рэспублікі і Ўрад разагнаны немцамі, а затое ў Слоніме адбыўся новы "ўсебеларускі кангрэс", каторы выбраў "дырэкторыю" зь пяцёх асоб, за галаву яе назначыўшы яго, Бахановіча. Нягледзячы на паказаньне "натарыяльных" копій пастаноў "кангрэсу", ніколі ня быўшага, прадстаўнікі ўраду Бел. Нар. Рэспублікі зразу "раскусілі" самазванца і раскрылі яго карты перад французскай галоўнай камандай у Адэсе, да каторай Бахановіч зьвярнуўся па пропуск у Парыж на міравую канфэрэнцыю. Адначасна Бахановіч зьвязаўся з генэралам Дзянікіным, абвесьціў ад імя Беларусі прылучэньне яе назад да Расеі, атрымаў некалькі сот рублёў "задатку" за прадажу Беларусі і меўся атрымаць некалькі мільёнаў "на арганізацыю беларускай арміі",



каб, маючы пропуск у Парыж, з гэтымі грашмі пусьціцца на вольны сьвет. Генэрал Дзянікін, верачы Бахановічу, паслаў яму прывітальную тэлеграму, выказваючы сваю радасьць з прычыны павароту беларусаў пад "Матушку-Расею"! Але адэскія беларусы папсавалі ўсе пляны Бахановіча: французы яго арыштавалі як звычайнага ашуканца і выпусьцілі, толькі ўзяўшы падпіску, што пакіне распачатую авантуру. Дзянікін таксама адрокся ад яго і грошы ня даў...» [5]

Больш грунтоўна гісторыю з абвяшчэннем «урада» апісаў у справаздачы ад 19 снежня 1919 года консул БНР у Адэсе Сцяпан Некрашэвіч: «...На адэскім беларуска-палітычным небасхіле праізашлі важныя з'явы. Да Адэсы сталі прыезджаць так званыя члены кіеўскага савешчаньня беларускіх грамадзянскіх палітычных дзеячаў, якія сталі прэтэндаваць на глаўную ролю па беларускаму пытаньню. Між іншым, прыехалі: А. Бахановіч, бар. Розен, палк. Беляеў, Кадыгробаў, Лютамірскі, Гартынскі, генэр. Андрыеўскі, Карташоў і інш. Прэдвадзіцельстваваў Бахановіч. Усе гэтыя "дзеячы" зразу жа сустрэлі моцны адпор як з майго боку, так і з боку адэскае нацыянальнае Рады, досыць моцнай арганізацыі, якая ва ўсім мяне падтрымлівала. Тады кіеўскія дзеячы прапанавалі кампраміс — зарганізаваць адну агульную арганізацыю. Штоб не перэшкаджаць глаўнай нацыянальнай справе, мы згадзіліся. У рэзультаці гэтаго быў зарганізаваны "Белорусскій Національный Центръ", з'яўляўшыйся вышэйшаю палітычна-грамадзянскаю арганізацыяю для прэдстаўніцтва перад дзержавамі згоды і дабравольчаю арміяю... Старшыною Цэнтра спачатку быў я, пасьля Бахановіч і ў канцы Грамыко, член адэскае нацыянальнае Рады. Спачатку праца ў Цэнтры ішла згодна. Была вырабатана дэклярацыя на ўсесьветную канфэрэнцыю, другая дэклярацыя была паслана да Дэнікіна... Повад да разрыву зрабіў Бахановіч. У Цэнтр была ўнесена прапазыцыя аб выбару членаў ад Цэнтра на Сусьветную канфэрэнцыю. Ні ведаючы, ці зроблены такія выбары ад цэнтральнае беларускае Улады, наша левае крыло на выбары згадзілася. Выбраны былі я, Бахановіч і Базарэвіч. Тады Бахановіч унёс у Цэнтр другую прапазыцыю — аб абразаваньні беларускага краевого Ураду, знаходзячы, што безсэнсна пасылаць дэлегатаў на кангрэс ад арганізацыі, а не ад Ураду. Яго прапазыцыю падтрымаў Базарэвіч і кіеўскае савешчаньне... На двох пасядзэньнях дэбатавалася гэтае пытаньне і вырашылася не на карысьць Бахановіча. Тады ен з Базарэвічам паставілі Цэнтру ўльціматум: калі краевы Урад не будзе зарганізаваны, тады яны адказваюцца ехаць да Парыжу. Апошнее Цэнтрам было прынято з легкім сэрцам, і былі назначаны другія выбары. На гэты раз былі выбраны: я, Ладноў і Ігнацьеў... Балаціраваўся і Бахановіч, але на гэты раз быў забалаціраваны. Пасьля гэтаго Бахановіч пачаў усюды абліваць гразьзю нашую дэлегацыю і стаў рабіць правакатарскія заходы, штоб нашай дэлегацыі ні далі візы для праезду ў Парыж. Аб гэтым у мяне былі яго дакумэнты, і за гэта ен быў выключаны із саставу членаў Цэнтра...

Праз колькі дзён — гэта было ў канцы студня — Бахановіч з'явіўся ў Цэнтр, у якім ён пасьля правала на выбарах перастаў бываць, і прачытаў паперу, што ў Слоніме з'езд з прэдстаўнікоў усіх губэрняў Беларусі даручыў Гродзенскаму Камітэту аб'еднаных грамадзянскіх арганізацыяў (Бахановіч быў старшыною гэтаго камітэту) злажыць Урад і што згодна з воляй з'езда гродзенскі камітэт злажыў дырэкторыю із 5 асоб: яго, Бахановіча (старшына Ураду), Ілавайскаго, Бандарука і яшчэ двох асоб... Пры гэтым арыгінал паперы паказаны не быў. У адказ на гэта яму было прачытано аб выключэньні яго із саставу членаў Цэнтра "за неблагавідные поступки". На другі дзень у адэскіх газэтах была надрукована тэлеграма Дэнікіна, які прывітаў краевы Урад Бахановіча. Гэтае прывітаньне было ісхадатайствавана генэралам Гальфтэрам, пасланым кіеўскім савешчаньнем для палучэньня разрашэньня на фармаваньне Заходнай арміі. Яшчэ праз колькі дзён Бахановіч выступае ў мэмарандуме чатырох "гасударственных образованій": Беларусі, Дона, Кубані і Украіны».

У мемуарах Арнольда Марголіна (дыпламатычны прадстаўнік дырэкторыі ў Лондане, пісьменнік, грамадскі дзеяч, адвакат. — *Рэд.*) захаваўся тэкст самой заявы і даволі шырокі каментар да яе: «...Разам са мною ад імя ўкраінскага ўраду



заяву падпісаў д-р Галіп, ад Кубані — Л. Л. Быч, ад Беларусі — ген. Бахановіч, ад Дону — генерал Чарачукін... Ніжэйпадпісаныя, прадстаўнікі Украіны, Беларусі, Дону і Кубані, якія сабраліся ў Адэсе, на сумеснай нарадзе пастанавілі звярнуцца да Вярхоўнага Камандавання дзяржаваў Антанты з ніжэйпададзеным мемарандумам па пытаннях: 1. Аб рэформе дзяржаўнага ладу гэтых тэрыторый, роўна як і суседніх з імі дзяржаўных утварэнняў. 2. Аб шляхах і метадах для задушэння анархіі і бальшавізму ўва ўсіх тых дзяржавах і частках, на якія распалася Расея.

...Мы, прадстаўнікі Украіны, Беларусі, Дона і Кубані, прыйшлі да глыбокага пераканання, што пытанне дзяржаўнага ладу гэтых чытырох адзінак можа атрымаць хуткі і належны развязак толькі шляхам асобнага ажыццяўлення пачаткаў дзяржаўнасці і парадку ў кожнай з іх... І мы звяртаемся, цераз пасярэдніцтва Высокага Саюзнага Камандавання, да дзяржаваў Антанты з просьбаю пра аказанне магчымай дапамогі нацыянальным імкненням нашых народаў да ўмацавання ўжо створаных асобных утварэнняў. І толькі пасля задушэння бальшавізму і анархіі, калі насельніцтва кожнага такога ўтварэння будзе мець магчымым свабодна выказаць сваю сапраўдную волю, надыдзе час для высвятлення тых ці іншых умоваў пагаднення паміж імі на пачатках свабоды, роўнасці і братэрства ўсіх народаў, пачатках, выказаных вашымі вялікімі нацыямі... Мы звяртаемся да Саюзнага Камандавання таксама па тэхнічную дапамогу і па ўсе тыя прадметы, якіх у нас зусім няма ці якія ёсць у недастатковай колькасці. У першую чаргу нам неабходны стрэльбы, патроны, мітральезы (станковыя кулямёты. — *А. Ч.*), цяжкая артылерыя, а ў асаблівасці танкі і бліндзіраваныя (бранiраваныя. — *А. Ч.*) аўтамабілі.

...Мы дапускаем, што для больш паспяховай арганізацыі барацьбы трэба стварыць агульны генеральны штаб для кіраўніцтва ўсімі аперацыямі на аснове ўзаемнага пагаднення дзяржаўных новаўтварэнняў, якія знайходзяцца ў стане вайны з бальшавізмам, паміж сабою і ў кантакце з дзяржавамі Антанты. Такі штаб не павінен быў бы ўмешвацца ў палітычнае жыццё і ўнутраныя справы дзяржаўных новаўтварэнняў».

Ужо 5 лютага 1919 года заяву надрукавалі ўсе адэскія газеты, што выклікала шырокі грамадскі рэзананс і жорсткія нападкі з боку прадстаўнікоў той палітычнай плыні, якая чакала выратавання Расіі ад Добраахвотніцкай арміі генерала Антона Дзянікіна. Пазней аказалася, што ў Адэсе знаходзіцца беларускі консул С. Некрашэвіч, які аспрэчваў правамоцнасць дэлегацыі Бахановіча і меў даверанасць ад урада БНР.

«Мы не маглі ўмешвацца ў разгляд чужых унутраных справаў, — адзначае далей А. Марголін, — а таму задаволіліся тым, што Некрашэвіч у сваю чаргу далучыў свой подпіс да нашай заявы, пра



што апавясціў і вярхоўнае саюзнае камандаванне. Як мы ўстанавілі, французы лічылі Некрашэвіча прадстаўніком больш аўтарытэтнай плыні ў Беларусі» [12].

«У гэты ж час я атрымаў ад Бахановіча паперу звярнуцца да яго за палучэньнем консульскіх паўнамоцтваў, — паведамляе Некрашэвіч. — Апроч таго, я атрымаў весткі, што ён вядзе ўмовы з украінцамі аб 500-міліонным займе. Тады я рашыў уступіць з ім у барацьбу. Перш усяго я ў адэскія газеты за сваім подпісам паслаў ліст вельмі рэзкага характэру, што едынай уладай на Беларусі з'яўлаецца ўлада Беларускае Рады, выбранай Усебеларускім з'ездам у 1917 р., што іменуюшчы сябе старшыною Беларускаго Ураду А. Бахановіч выключанны "за неблагавідныя поступкі" із саставу членаў Цэнтра, зладжыў Урад самачынна і самазванна і што мною і Беларускім Цэнтрам прыімаюцца меры да ліквідацыі авантуры Бахановіча. Падобна гэтаму заяўленьню, я зрабіў заяву французам, украінскай місіі, кубанскай дэлегацыі, грузінскаму консулу і др. прэдстаўнікам нацыональнасьцяй, у рэзультаці чаго перад Бахановічам дзьверы ўсюды зачыніліся. Так ён хацеў, штоб яго прыняў начальнік штабу д'Ансэльма палкоўнік Фрэйдэнберг. Для гэтаго ён засылаў генэр. Андрыеўскаго, але Фрэйдэнберг катэгорычна адказаўся прыняць Бахановіча. Перасталі прымаць яго і ўкраінцы. Ні нашоў ён падмогі і ў дабравольчам камандаваньні, бо начальнік палітычнаго аддзела Штабу дабравольчае арміі член Цэнтра палкоўнік Ёнгельгардт быў на

маем баку і аб самазванным урадзі Бахановіча паслаў вядомасьці ў Стаўку Дэнікіна. Тым часам прыехаў да Адэсы Белевіч і прывез вядомасьці пра наш урад і Раду. Што Бахановіча ўрад быў самазванна з'арганізаваны ў Адэсі, у мяне былі пэўныя вядомасьці. Із іх глаўная тая, што печатка для сваго ўраду Бахановічам была зроблена раней, як адбыўся міфічны з'езд у Слоніме. Бахановіч пробоваў устаць на ногі і так сама некалькі разоў выступаў у газэтах, гаварыў, што Рада не істнуе, даводзіў да ведама, што ён мяне лішыў паўнамоцстваў, гразіў аддаць пад суд, але мне на падмогу прышлі Цэнтр, адэская Рада і беларускі гурток рабочых, якія так сама вынеслі рэзалюцыі проціў Ураду Бахановіча і надрукавалі іх у газэтах. Бахановіч павінен быў афіцыяльна сазнацца, што палітычная справа яго ў Адэсі кончана, аб чым ён і заявіў у газэтах, што адказваецца ад уселякай палітычнае і грамадзянскае працы. Так безслаўна скончылася авантура Бахановіча...» [3, с. 549–550]

Перад ад'ездам з Адэсы А. Бахановіч павінен быў адмовіцца ў мясцовых газетах ад «усялякай палітыкі і прэтэнзій на кіраванне Беларусьсю». Ён так і зрабіў, аднак дадаў у прыватнай гутарцы, што «калі прыедзе ў Гродна, то будзе там кіраваць, бо ў Гродна яго ўсе добра ведаюць, а тут, у Адэссе, — ніхто».

І насамрэч, калі вясной 1919 года А. Бахановіч трапляе ў Гродна, то адразу разгортвае шырокую дзейнасць ад імя Гродзенскага губернскага цэнтральнага камітэта аб'яднаных грамадскіх арганізацый. «...Нядаўня ў Гродна прыехаў Бахановіч, — дакладаў у лісце да міністра ўнутраных спраў БНР К. Цярэшчанкі гарадзенец У. Курбскі, — і хоча разам з Управай разбіць Цэнтральную Беларускую Раду Гродзеншчыны. Сялянская рада, рашыўшы, што Бахановіч мае грошы, хацела ўжо ісці за ім, але мы астанавілі, сказаўшы, што хутка прыедзе Ластоўскі. Так сама хоча зрабіць і вучыцельская рада. Безденежье губіць усю справу...»

«Трохі шкодзіць працы арганізованная Якаўлюком і Бахановічам "Вучнёўская грамада", — пісаў У. Курбскі К. Цярэшчанку ў канцы красавіка, — але мы з ею борэмся, і яна, не маючы нічога рэальнага, ужо распадаецца» [8, л. 141–141 адв.].

У сярэдзіне чэрвеня 1919 года ў Гродне прайшла шырокая хваля арыштаў, арганізаваная польскімі ўладамі і накіраваная ў першую чаргу супраць мясцовага «расейскага элемента». Усяго, паводле Я. Антонава, было арыштавана 79 чалавек. Шмат хто з іх належаў да былых рускіх чыноўнікаў, звязаных з Гродзенскай управай ці Міністэрствам беларускіх справаў пры Літоўскім урадзе. Сярод арыштаваных апынуўся і А. Бахановіч, якога польскія ўлады інтэрнавалі ў лагер Домб'е [11].

З Домб'я ў лістападзе 1919 года А. Бахановіч зноў вяртаецца ў Гродна і на кароткі час спыняецца ў гатэлі «Раяль». На гэты раз ён звяртаецца да польскай адміністрацыі з прапановай сфарміраваць рускую добраахвотніцкую армію ў складзе польскага войска ды адкрыць у горадзе «Рускі камітэт». Адначасова 29 снежня 1919 года ў сваім дакладзе міністру замежных спраў белагвардзейскага Усерасійскага ўрада Калчака і Дзянікіна С. Сазонаву, які знаходзіўся ў Парыжы, А. Бахановіч паведамляў пра становішча на Гродзеншчыне: «...Магу смела заявіць, што сялянскі элемент стаіць на адмоўных адносінах як да Польшчы, так і да Літвы, прызнаючы сябе толькі рускімі і жадаючы бачыць сябе ў складзе адзінай,



непадзельнай Расіі. Насільна ўвадзімую ў школах беларускую мову... сяляні і слухаць ня хочуць, а многія вёскі забралі са школак сваіх дзяцей толькі таму, што выкладанне ў іх вядзецца на беларускам нарэчыі... Мы патрабуем свабоды функцыянавання расійскіх грамадскіх арганізацый, школ, кааператываў і г. д., так як штучныя "беларускія" ўстановы, ствараемыя ці палякамі, ці іх агентамі, цалкам не адпавядаюць жаданню беларускіх мас, і насельніцтва іх ігнаруе. Што тычыцца школ, то насельніцтва станоўча заяўляя аб не жаданні вучыць сваіх дзяцей на той тарабаршчыне, якая носіць назву "беларускай мовы" і якая дазваляецца палякамі, у той час як руская мова забаронена для карыстання ня толькі ў школах, а нават у шыльдах і аб'явах. Забараняючы рускую мову і выдатна разумеючы, што з беларускай мовай далёка пайсці нельга, палякі гэткім чынам жадаюць штучна абязлічыць народ, прымусіць яго заставацца цёмным і паспрабаваць адарваць ад рускага роднага цела...»

На пачатак 1920 года А. Бахановіч перабіраецца ў Прагу, пасля чаго ў газеце «Прикарпатская Русь» была надрукаваная аб'ява пра тое, што хутка мае

адбыцца сход «беларускіх грамадскіх дзеячаў» (прычым у якасці кантактнага адраса была пададзена рэдакцыя газеты «Русское дело»), а ў канцы таго ж года робіць спробу паразумецца з Б. Савінкавым. Але адведзены А. Бахановічу час ужо скончыўся. Што праўда, ягоная гарачая натура яшчэ спрабавала дастасавацца да новага ладу. Ён у чарговы раз прыязджае ў Гродна, дзе пачынае судовую справу аб кражы маёмасці з кватэры сваёй памерлай маці, чым, паводле ягоных слоў, настройвае супраць сябе мясцовую польскую адміністрацыю, якая намагалася пазбавіць А. Бахановіча польскага грамадзянства і выслаць за межы краіны як небяспечнага для Польшчы чалавека. Паступова ягоны «інтарэс» робіцца зусім дробным: ад мары пра пасаду беларускага дыктатара А. Бахановіч скочваецца да выканання абавязкаў паўнамоцнага прадстаўніка княгіні М. Вяземскай. Ён адстойвае яе правы на былы маёнтак каля м. Азёры, якім кіравала таварыства «L'Immobiliere de France et des Colonies», пакуль, нарэшце, ягоныя сляды ў гісторыі канчаткова не губляюцца [4, л. 1–3].

Крыніцы і літаратура

1. Biblioteka Publiczna m. st. Warszawy. Dzial Starych Druków i Rękopisów. Zarząd Cywilny. Ziem Wschodnich. Nr. akc. 1773/3/I.
2. *Антонаў І.* Успаміны аб польскай акупацыі Горадзеншчыны ў 1919–1921 гг.: Малюнкі гвалту і зьдзеку фацетных польскіх паноў на Беларусі: (Мае перажываньні). [Б. м.], 1921.
3. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Кн. 1, т. 1. Нью-Ёрк і інш.: Бел. ін-т навукі і мастацтва, Т-ва бел. пісьменства «Наша ніва», 1998.
4. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 17. Воп. 1. Спр. 42.
5. *Луцкевіч А.* Самазванцы // Наша Думка. 1921. 14 студз.
6. *Луцкевіч А.* Дзённік // Полымя. 1991. № 4. С. 205–224. № 5. С. 168–191.
7. *Мядзёлка П.* Сцежкамі жыцця. Мінск: Мастацкая літаратура, 1974.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 325. Воп. 1. Спр. 22.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 458. Воп. 1. Спр. 9. Л. 89–102.
10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 878. Воп. 1. Спр. 8. Л. 33, 38.
11. *Пануцэвіч В.* Гарадзеншчына ў нацыянальным руху ў 1918–1919 гадах // Бацькаўшчына. 1964. № 5–6.
12. *Прэўрацкі В.* Малавядомы дакумент часоў БНР // Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны: [сайт]. URL: http://tbm.org.by/ns/no500/25sakav2.html
13. *Сідарэвіч А. М.* Бахановіч А. А. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. В. Біч і інш. Мінск: БелЭн, 1993. Т.1. С. 332.

Страсти по выборам

Две колонны



Анатолий ГУЛЯЕВ

...Еще одно качество Эдвардовича — как бы это поинтеллигентнее... Ну просто потрясающее упрямство! Его нельзя сравнить даже с аналогичным качеством моего внука Феденьки. Тот, гуляя по квартире в любимой пижамке, разрисованной страшноватыми крокодилами Генами, откровенно наслаждается уговорами бабушки и мамы, проявляя при этом настоящий мужской характер:

— Не пойду на улицу! Не хочу!

Я его понимаю: на улице свежий воздух, но холодно. А дома несвежий, но тепло — и не уговариваю. За что подвергаюсь, естественно, резкой критике со стороны бабушки и мамы...

Но потом Феденька все же соглашается...

— Не буду! — говорит Эдвардович. — Не уговаривайте!

И, похоже, он не согласится. На его породистом лице потомственного шляхтича зависло выражение, какое было, наверное, у его же далекого предка, когда тот собирался сказать свое «nie pozwalam!» решению очередного когда-то всевластного здесь местного сеймика. Решению, которое стоило многих предварительных переговоров, многих усилий всей остальной шляхты и которому теперь, в силу «гоноровости» одного только свободного индивидуума, предстояло, как говорят братья-поляки, идти «do dupy»!

— Не буду! — говорит Эдвардович.

«Дед Сергеевич», седой и благообразный директор новоселковской школы, осиянный роскошной седой бородой, которая у него всегда воинственно топорщится, резво вскочил с места и неинтеллигентно, но длинно матюгнулся... С упоминанием разнообразных, широко известных по Библии лиц и большого количества противоестественных действий, которые к этим лицам должны быть, по его мнению, применены. Так материться в годы моей службы в Советской Армии умел только заместитель командира родного 180-го танкового полка подполковник Литвинов. Небольшого роста, в сдвинутой налево фуражке с черным околышем и высокой тульей, стройный, как кирасирский ротмистр из свиты Яна Казимира Вазы...

Перед строем полка на утренних разводах он создавал грандиозные по изяществу конструкции из небольшого, в общем, количества исключительно неизящных русскоязычных идиоматических выражений! Полк, застывший на плацу в ротных колоннах, наслаждался и ловил каждое слово! Большой был мастер!

Но Сергеевич-то — деревенский интеллигент! Потом Францевич (местный участковый, которого здесь чаще зовут «урядник») шепнул мне на ухо, что за грехи отца и старшего

брата — участников «бульбовских» формирований на белорусском Полесье — семья Сергеевича после войны была выслана за Урал. Где-то там, на лесоповалах, он и нахватался.

...Мы сидим в кабинете у Эдвардовича, председателя большого местного СПК. После последних принудительных укрупнений хозяйство выросло до 11 000 гектаров сельхозугодий (из них 8000 гектаров пашни).

И обсуждаем, за кого агитировать народ на приближающихся парламентских выборах. Областные демократы выдвинули местного учителя труда Миколу. Его зарегистрировали как кандидата в депутаты, и Сергеевич стоит за него горой! А Эдвардович, чье слово тут на вес золота, уперся и агитировать за Миколу не хочет. Предпочитая кандидата от власти, главврача районной больницы, — человека конъюнктурного, но исключительно делового.

— Что ты имеешь против Миколы? — не понимает Сергеевич. — Чистый, честный парень! Дети в школе за ним цугом ходят...

— Так выдвини его в заведующие детским садом! Тоже аргумент — «дети цугом»... А он когда-нибудь чем-нибудь руководил? А он знает, что такое политика? Конечно, хороший, простодушный хлопец — ему стихи читать со сцены... А в том парламенте змеятник... Ему нельзя туда: или сожрут, или испортят!

— Миколу ничем не испортишь! В депутаты таких и надо!

— Таких... А то ты не знаешь, не научился еще? Туда надо таких, как Францевич: чтобы мог, когда надо, прогнуться, а когда надо — и в морду...

— Как в морду — так Францевич! Вы что, все с дуба упали? Когда я кого бил?

Вопрос был риторический. Францевич — блондинистый, краснощекий майор милиции — всякий раз, когда, по его мнению, это требовалось, дать в морду умел. И, мне иногда даже кажется, любил. Но не любил, когда об этом говорят.

— Успокойся, я так это...

— Все вы так... Только одно и видите...

Похоже, Францевич в очередной раз поссорился с женой, завмагом местного сельпо, именуемой в Новоселках Валькой-магазинщицей. И потому сегодня воспринимал действительность с ранимостью известной принцессы, которая под горой пуховых перин обязательно чувствует крошечную горошину.

— Нашли вы тему! — взвился Сергеевич. Его седая борода воинственно топорщилась, как у разгневанного бога Саваофа на картинках из «Библии для верующих и неверующих». — Времени не осталось, давайте к делу.

— Какое тут может быть дело? — Эдвардович спокоен, как удав из известного мультика. — Я ему помогать не буду. Это вы в 90-х наизбирали во власть людей, которые, кроме как митинговать и ругать партократов, ничего не умели. А потом и саму власть...

Он обернулся ко мне:

— Как это интеллигентно сказать?

— Профукали?

— Я бы, конечно, сказал «прос...ли». Но пусть будет «профукали»...

Лицо Сергеевича медленно наливается кровью. В 90-е он был депутатом парламента и проводил время не в школе, а большей частью в Овальном зале Дома правительства в Минске, т. е. «прос...ли» относилось к нему тоже. Правда, когда парламент благополучно разогнали, он, не желая покидать кабинет, упирался до последнего. А «последнее» выглядело так: двое громил из охраны президента волокли его по коридорам власти, словно злобные зятья вконец упившегося нелюбимого тестя. Сергеевич дергался, упирался и хорошо поставленным учительским голосом выкрикивал проклятия в адрес режима! Напоминая то ли Тараса Бульбу в последней схватке с ляхами, когда он, явно переоценив свои возможности, решил вернуться за уроненной в пылу боя люлькой... То ли скульптурную группу, где Лаокоон (только без сыновей) безуспешно сражается с опутавшими его змеями.

Из Дома правительства Сергеевича, естественно, выбросили прямо на только что выпавший снег: беленький и хрустящий, как простыни в доме у Эдвардовича, где царила его жена — маленькая, верткая полешучка Ольга. Я видел процедуру выбрасывания сам, поскольку толкался там же в толпе журналистов, надеявшихся, что Сергеевич без боя не сдастся. И радостно заклацавших затворами фотокамер, переключателями диктофонов. Кто-то из особо догадливых даже приготовил плоскую фляжку «буслов», которую тут же располовинил с «дедом Сергеевичем» под завистливые взгляды остальных, менее догадливых.

Через пару дней Сергеевич честно вернулся в Новоселки. И ему даже не помешали занять прежнюю должность директора школы.

...Словом, мы ни до чего не договорились — было совершенно очевидно, что местная элита пойдет на выборы разными колоннами. Правда, их будет не десять, как у демократов в 2010 году, но две — точно. Одна — Сергеевич с Миколой, агрономом Петровичем по прозвищу «ученый» (как пишут в дипломах Горецкой академии, «ученый агроном»), еще двумя учителями и одной библиотекаршей... Люди все хорошие, но маловлиятельные. К тому же Сергеевича нынче «вертикаль» даже не рекомендовала в председатели участковой избирательной комиссии, составленной исключительно из учителей его школы. Т. е. даже повлиять на качество подсчета голосов он теперь не мог.

Другая колонна — Эдвардович, а с ним все практически специалисты и основная масса населения, живущая по принципу: как батька скажет... Не говоря уже о власти.

Наполеон Бонапарт в такой ситуации смотал бы знамена, сдался на милость победителя и с чистой совестью отправился под конвоем на остров святой Елены. Но Сергеевич сдаваться не собирался…

Участок

…Зерновые уже обмолочены, и Эдвардович привычно сообщает в сводках, что да, по 60 центнеров с гектара у него есть. Копать картошку еще только начали, но и там не менее чем по 500 центнеров с гектара будет. Ничего удивительного: удобрений хватает, техника сплошь немецкая, культура земледелия — голландцам поучиться! Не зря Эдвардович регулярно повторяет: поле готово к севу, когда я могу проехать по нему на своем «Мерседесе» со скоростью 100 километров в час. Ну сто не сто, а поля гладенькие, как щека любимой женщины, и мягкие, как ее же… Словом, мягкие.

Сентябрь нынче солнечный, теплый. Пуща за Новоселками на фоне синего неба вся рыжая и золотая. Она даже на расстоянии успокаивает и манит под лучами заходящего солнца — такие ощущения бывают после первой рюмки хорошего местного самогона.



Избирательная комиссия расположилась в школьном спортивном зале: длинный стол, накрытый красным; кабинки для голосования — тоже красные. Отдельно — стол для наблюдателей из команды Сергеевича с ним самим во главе.

В фойе — магазин с мануфактурой, буфет с бутербродами, колбасой, громадным количеством печеньев и булочек и удивительно дешевой водкой. Там уже с утра толкаются все те же персонажи: недавно вернувшийся из тюрьмы Канарис (он же Лобанович) в компании с Брателлой (он же Игнатович) и примкнувшие к ним местные забулдыги. Нарядные местные тетки и дядьки пользуются случаем, покупая по дешевке продукты и мануфактуру. «Валька-магазинщица» руководит процессом, наливая, взвешивая и отмеривая. Францевич, ее муж, где-то мотается по Новоселкам, создавая видимость борьбы за порядок в день выборов. Находиться на участке, охраняя урну с бюллетенями, районное начальство ему не доверяет. На эту ответственную должность прислан «зеленый» лейтенант из района — восприимчивый и послушный, словно юная жена в первый день после свадьбы. Он ест глазами начальство и уже враждебен к Сергеевичу.

— Все нормально! — бодро рапортует Эдвардовичу председатель комиссии, завуч местной школы Людмила Ивановна — миловидная, пепельноволосая и вообще во всех отношениях приятная. Ей чуть-чуть бы еще длины ног и объема бюста… И приятности бы добавить в профессионально проницательный завучский взгляд — совсем бы была «ягодка опять».

— Уже сейчас, на 16.00, проголосовало больше половины избирателей. Выборы состоялись!

Людмила Ивановна радуется, словно уже состоялись не выборы, а ее свадьба — вторая по счету. Она пару лет назад развелась с первым мужем — хорошим местным парнем, но всего лишь механизатором, за которого неосмотрительно вышла, приехав после областного «педа» в Новоселки. Потом быстро поняла, что могут быть другие варианты. Развелась и теперь состоит в невестах…

— Интересно, — говорит Сергеевич. — Мы фиксировали каждого избирателя пофамильно, с указанием времени прихода на участок. У нас набирается меньше 40 %. Даже с учетом досрочного голосования…

— Не знаю, как ваши люди фиксировали… — упорствует Людмила Ивановна.

Видно, что конфликт с директором ее не смущает, поскольку работать с ним после этих выборов ей, судя по всему, не придется. Мало того что Сергеевич слывет оппозиционером, так он еще и пенсионер. Его обязательно уберут. А Людмиле Ивановне нужно, чтобы выборы состоялись, — тогда она первый кандидат в директоры! А если она в свои неполные 40 станет директором, то там — ого! — вариантов множество: со временем прямая дорога в заместители председателя райисполкома, а то и в область! Да мало ли куда судьба может вынести приятную женщину, желающую сделать карьеру во властном мире — почти исключительно мужском?

— Осталось недолго — посчитаем голоса, и все станет ясно…

Вброс

Мы вышли на школьное крыльцо.

— Они что-то задумали! — говорит Сергеевич. — Вброс будет. Но когда? Пока что в школу дополнительные бюллетени не привозили — мы там круглые сутки дежурим!

У Эдвардовича звонит мобильник.

— Что такое, Францевич? Где? Едем... — решительно сказал он. И повернулся к нам. — Вы тоже со мной.

— Я не могу, — сказал Сергеевич. — А кто наблюдать будет?

— Уже не надо наблюдать...

Ничего не понимая, мы сели в председательский «Мерседес», по случаю выборов сменивший рабочий УАЗ, и поехали на выезд из Новоселок, мимо разноцветных «президентских» домиков в сторону райцентра. Далеко ехать не пришлось: через пару километров на обочине сгрудились несколько машин, в числе которых новенькая черная «Волга» с разбитым радиатором и вздыбившимся капотом. Рядом «Опель» с помятым крылом и покореженными дверцами... Рядом разноцветный гаишный «Опель».

Люди в фуражках что-то замеряли. На обочине, закрыв окровавленное лицо руками, сидел человек.

В группе рядом стоящих зрителей я узнал яростно жестикулирующего Брателлу.

— Он пьяный как шнурок! — радостно сообщил подошедший Францевич. — Раздолбал исполкомовскую «Волгу», но это ладно. Я вызвал ГАИ — разберутся. Ты посмотри, что в «Волге» было...

На заднем сиденье белел разорванной при ударе упаковкой бумажный пакет. Вокруг него и на полу беспорядочно лежали избирательные бюллетени.

— 200 штук, я посчитал, — сказал Францевич. — И во всех крестики стоят против фамилии того... Из района...

Все было понятно. Видя, что выборы не складываются, Людмила Ивановна запросила помощи из района. Оттуда с нарочным, одним из чиновников исполкома, отправили пакет с дополнительными бюллетенями. И все бы прошло, бюллетени бы вбросили в урну с позволения послушного лейтенанта, не возникни на пути «Опель» пьяного Брателлы.

Дальше было просто. Еще до приезда ГАИ мы собрали бюллетени. Травмированного чиновника «скорая» забрала в больницу. А мы помчались в Новоселки на участок, благо было уже половина восьмого вечера. Там члены комиссии — учительницы местной школы плюс плотный паренькфизрук, — став плотной стеной вокруг стола, уже считали голоса. Как водится, наблюдателей близко не подпускали, и, что они там считают, видно не было. Скоро был вывешен протокол: явка — 53 % избирателей, выборы состоялись. Внушительную победу одержал кандидат от власти.

Но, по данным наблюдателей Сергеевича, явка составляла только 43 %. Разница в количестве проголосовавших у Сергеевича и комиссии была примерно в 200 человек.

Мы подошли к Людмиле Ивановне.

— А как получилась эта разница?

— Не знаю. Но, чтобы у вас не было сомнений, я готова даже пойти на нарушение закона: через полчаса-час, когда все успокоится, в присутствии членов комиссии дам вам пересчитать.

— Я думаю, нам не нужно ничего ждать. Он не приедет.

— Кто он?

Францевич вышел к своей машине и вернулся с пакетом, перевязанным бечевкой.

— Вот ваши потерявшиеся голоса!

— За это уже «закрывают» — и надолго! — задумчиво пробормотал Францевич.

Надо отдать должное: Людмила Ивановна реагировала быстро. Мы не успели насладиться зрелищем, как она метнулась с места, сорвала со стены протокол и куда-то умчалась, продемонстрировав хорошую стартовую скорость! Это в ее-то узкой юбке и на «шпильках»!

Мы только и успели, что открыть рты и переглянуться! Через небольшое время она, вальяжно цокая каблуками по выложенному плиткой полу коридора, появилась опять, прикнопила к стене новый экземпляр протокола.

— Какие ко мне претензии?

Мы, словно завороженные пением одиссеевских сирен, подошли, ощущая себя в некотором таком тумане. В протоколе значилась уже 43 % избирателей, т. е. по факту.

— А эти все бюллетени, что вы неизвестно откуда взяли, можете выбросить на помойку...

Сергеевич стал фотографировать новый протокол. Людмила Ивановна порекомендовала не трудиться и принесла копию. Мы вежливо попрощались и вышли на крыльцо.

Францевич обалдело покачал головой:

— А я «закрываю» пьянчуг... Вот кого нужно «закрывать»! Вот у кого совести совсем нет.

И вдруг оживился:

— А знаете что, мужики? Я ее два раза оттрахал! По пьяни...

Его краснощекое с подстриженными офицерскими усиками лицо светилось совершенно демоническим торжеством! Такого качества эмоции раньше были отмечены разве что на лице адмирала Нельсона после разгрома им французского флота при Абукире.

— Кого оттрахал?

— Да Людмилу эту...

— И как?

— А, абы что. Моя Валька лучше!

— Так зачем ты тогда?..

— Ну в первый раз я не знал, что Валька лучше.

— А во второй?

— Убедиться хотел.

— Убедился?

— Убедился, г...но!

И нам стало легче. Мы решили, что жалобу в Следственный комитет Сергеевич напишет завтра. А пока поехали к Францевичу, где «Валька-магазинщица» уже ждала нас за накрытым столом.

76 % беларусаў

маюць патрэбу ў свабодзе слова

Пра гэта сведчаць вынікі апытання сацыялагічнага цэнтра «ЛЮСТРА-ІНФА», праведзенага ўвесну.

Даследчыкі задалі беларусам тры пытанні: «Ці патрэбная вам асабіста свабода мітынгаў і дэманстрацый?», «Ці патрэбная вам асабіста свабода слова?» і «Ці патрэбная вам асабіста свабода выезду за мяжу?».

76 % рэспандэнтаў зазначылі, што ў той ці іншай ступені маюць патрэбу ў свабодзе слова. Пры гэтым больш за палову з іх — 41 % апытаных беларусаў — «адназначна маюць патрэбу» ў свабодзе слова, а для 35 % апытаных грамадзян яна, «хутчэй, патрэбная».

Пра сваю асабістую патрэбу ў свабодзе мітынгаў і дэманстрацый заявілі 46 % апытаных. Пры гэтым 27 % з іх адзначылі, што свабода мітынгаў, дэманстрацый ім, «хутчэй, патрэбная», а 19 % сказалі, што яна «адназначна неабходная».

Найбольш запатрабаваная сёння — свабода выезду за мяжу. У ёй маюць патрэбу 78 % рэспандэнтаў. Кожны другі дарослы беларус (50 %) «вельмі» хацеў бы выехаць за мяжу, яшчэ 28 % гараджан і вяскоўцаў не супраць гэтага.

Агульнанацыянальнае апытанне было праведзенае 29 сакавіка — 17 красавіка сацыялагічным цэнтрам «ЛЮСТРА-ІНФА». Апытана 3000 рэспандэнтаў. Памылка рэпрэзентатыўнасці не перавышае 0,6 %.

Стар. 19



